ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 6 (2275)
21 студзеня 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ЦК КП БЕЛАРУСІ СПАДЗЯЕЦЦА, ШТО ДАСТОЙНЫ ЎКЛАД ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА ЎНЯСУЦЬ ДЗЕЯЧЫ НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ, НАША ПРАЦОЎНАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ, УСЕ РАБОТНІКІ РАЗУМОВАЙ ПРАЦЫ, ШТО ЯНЫ БУДУЦЬ І Ў ДАЛЕЙШЫМ АДДАВАЦЬ СВАЕ СІЛЫ І ВЕДЫ ВЯЛІКАЙ СПРАВЕ КАМУНІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, З ВЫСОКІМ НАТХНЕННЕМ І НАСТОЙЛІВАСЦЮ РАЗВІВАЦЬ НАВУКУ І ТЭХНІКУ, СТВАРАЦЬ НОВЫЯ ЯРКІЯ ТВОРЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА, НЕСЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ КУЛЬТУРУ Ў МАСЫ, ДАПАМАГАЦЬ ВЫХОЎВАЦЬ ПАДРАСТАЮЧАЕ ПАКАЛЕННЕ Ў ДУХУ КАМУНІЗМА.

З Пастановы Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі ад 17 студзеня 1969 года.

СЛАВА ВАМ, КОСМАПРАХОДЦЫ!

Касмічныя падзеі апошніх дзён знаходзяцца ў цэнтры ўвагі ўсіх савецкіх людзей і сусветнай грамадскасці. Мужныя савецкія лётчыкі-касманаўты атрымалі новую перамогу ў космасе. Уладзімір Шаталаў, Барыс Валынаў, Яўгеній Хрунаў, Аляксей Елісееў паспяхова выканалі выдатны навукова-тэхнічны эксперымент.

У працэсе арбітальнага палёту яны ажыццявілі ўзаемны пошук, шматразовае манеўраванне, прычальванне і ручную стыкоўку караблёў «Саюз». Касманаўты А. Елісееў і Я. Хрунаў упершыню ў гісторыі касмаплавання прайшлі праз касмічную прастору з аднаго карабля ў другі. Паспяхова справіўшыся са складаным адказным заданнем, выканаўшы вялікі комплекс рознабаковых навукова-тэхнічных і медыка-біялагічных даследаванняў, героі-касманаўты шчасліва вярнуліся на родную зямлю.

Цэнтральны Камітэт КПСС, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР і Савет Міністраў СССР горача павіншавалі вучоных і канструктараў, інжынераў, тэхнікаў і рабочых, усе калектывы і арганізацыі, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і выкананні выдатнага навукова-тэхнічнага эксперыменту, нашых слаўных касманаўтаў з паспяховым ажыццяўленнем касмічнага палёту і выкананнем задання Радзімы.

Вестка аб вялікай перамозе ў космасе з вялікай цікавасцю сустрэта ва ўсім свеце. Вучоныя многіх краін, сусветная грамадскасць падкрэсліваюць, што зорны подзвіг мужнай чацвёркі, бліскучы поспех савецкай навукі і тэхнікі адкрываюць перад касмаплаваннем новыя гарызонты. Эксперымент савецкіх касманаўтаў мае важнае значэнне для далейшага развіцця пілатуемых палётаў і стварэння арбітальных станцый, якія дазволяць рашаць шырокае кола навуковых і народнагаспадарчых задач. Такія станцыі дадуць магчымасць нашым вучоным значна пашырыць веды аб будове Сусвету, лепш вывучаць уласную планету Зямлю і больш поўна выкарыстоўваць яе рэсурсы на карысць чалавецтва.

Усіх нас натхняе той факт, што перспектыву пакарэння космасу адкрылі нашы, савецкія вучоныя, інжынеры, рабочыя, пілоты зорных караблёў. Гэта яшчэ раз наглядна пацвярджае, наколькі ў нас вялікія стваральныя сілы народа, сацыялістычнага ладу, магчымасці айчыннай навукі і тэхнікі.

І вось зорныя браты зноў у абдымках сваіх зямных сяброў. Іх подзвігам ганарыцца ўвесь савецкі народ. Іх подзвігам ганарацца і працоўныя нашай рэспублікі, ганарыцца творчая інтэлігенцыя — пісьменнікі і кампазітары, музыканты і артысты, прадстаўнікі вялікай арміі культурна-асветнага фронту.

Слава савецкім касманаўтам, якія пракладваюць новыя шляхі ў космас!

Слава савецкім вучоным, канструктарам, інжынерам, тэхнікам і рабочым, якія ствараюць новыя касмічныя караблі!

Слава Камуністычнай партыі Савецкага Саюза — натхніцелю і арганізатару ўсіх перамог савецкага народа!

МЫ НЕСЛІ, НЯСЁМ І НЕСЦІ БУДЗЕМ ЯГОНЫ, ЛЕНІНСКІ СЦЯГ...

Ул. МАЯКОЎСКІ.

Беларускі графік Сямён Герус ужо некалькі гадоў працуе над серыяй графічных лістоў, прысвечаных жыццю і дзейнасці Уладзіміра Ільіча Леніна. Сюжэты лістоў самыя разнастайныя: Ільіч за работай, у часе гутаркі з аднадумцамі па рэвалюцыйнай справе, з рабочымі і сялянамі, на адпачынку.

Сёння мы друкуем рэпрадукцыі трох лістоў з гэтай серыі. На першым з іх Уладзімір Ільіч задушэўна гутарыць з салдатам.

Другі ліст — Ленін на прагулцы ў Горках. А на трэцім лісце Уладзімір Ільіч — у канцы напружанага працоўнага дня.

Работа над ленінскай серыяй працягваецца. С. Герус мяркуе завяршыць яе да мастацкай выстаўкі, прысвечанай стагоддзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча.

АБ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАХ КАЛЕКТЫВАЎ ПЕРАДАВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ РЭСПУБЛІКІ ЗРАБІЦЬ 1969 ГОД ГОДАМ ЛЕНІНСКАЙ УДАРНАЙ РАБОТЫ

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП БЕЛАРУСІ АД 17 СТУДЗЕНЯ 1969 ГОДА

Цэнтральны Камітэт КПСС у пастанове «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» заклікаў рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыю, савецкіх воінаў адзначыць ленінскі юбілей новымі перамогамі ў барацьбе за ажыццяўленне планаў камуністычнага будаўніцтва, намечаных Праграмай КПСС і рашэннямі XXIII з'езда партыі.

ЦК КП Беларусі з задавальненнем адзначае, што камуністы, усе працоўныя рэспублікі актыўна ўдзельнічаюць у сацыялістычным спаборніцтве, якое разгарнулася ў нашай краіне, за дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, поўныя непахіснай рашучасці працаваць і жыць па-ленінску, няўхільна выконваць вялікія ленінскія запаветы. Разам з усімі народамі Краіны Саветаў беларускі народ дабіваецца буйных поспехаў у развіцці эканомікі і культуры, уносіць дастойны ўклад ва ўмацаванне магутнасці нашай Радзімы. Пад знакам вернасці ленінскай партыі, справе Леніна, яго неўміручым ідэям прайшлі падрыхтоўка і святкаванне паўвекавога юбілею Беларускай ССР і Кампартыі Беларусі. У ходзе юбілейных урачыстасцей беларускі народ з новай сілай прадэманстраваў сваю бязмежную адданасць вялікім ідэалам камунізма, сваё гарачае імкненне і ў далейшым пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ісці выпрабаваным ленінскім курсам, развіваць і памнажаць поспехі ў камуністычным будаўніцтве.

Творча развіваючы і ўзбагачаючы спаборніцтва ў гонар ленінскага юбілею, з выдатнай ініцыятывай у першыя дні надышоўшага года выступілі калектывы Мінскага ордэна Леніна трактарнага завода, Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга аўтамабільнага завода, Віцебскага дывановага камбіната, Гомельскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання і Мінскага завода аўтаматычных ліній. Яны вырашылі аб'явіць 1969 год годам ленінскай ударнай работы, годам высокай прадукцыйнасці працы і выдатнай якасці прадукцыі і праз газету «Труд» звярнуліся да ўсіх вытворчых калектываў з заклікам падтрымаць іх пачын, праславіць Радзіму новымі працоўнымі здзяйсненнямі.

Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі ўказаных прадпрыемстваў абавязаліся на аснове паскарэння тэхнічнага прагрэсу, больш эфектыўнага выкарыстання матэрыяльных і працоўных рэсурсаў і актыўнага ўкаранення перадавога вопыту павысіць тэмпы росту прадукцыйнасці працы, выпуску прадукцыі і палепшыць яе якасць.

Трактарабудаўнікі, перавысіўшы праектныя магутнасці завода па выпуску машын, вырашылі выпусціць у гэтым годзе звыш плана 100 трактараў, перавыканаць заданне па росту прадукцыйнасці працы на 10 працэнтаў і павысіць фондааддачу на 1,5 працэнта. Гомельскія машынабудаўнікі абавязаліся ўвесь прырост выпуску сіласаўборачных камбайнаў у колькасці 3.500 штук забяспечыць за кошт лепшага выкарыстання магутнасцей і росту прадукцыйнасці працы, ад укаранення планаў НАП атрымаць не менш як 150 тысяч рублёў эканоміі. Віцебскія дыванаўшыкі намецілі выпрацаваць у гэтым годзе дывановых вырабаў на 100 тысяч квадратных метраў больш, чым прадугледжана пяцігадовым планам на 1970 год, пры гэтым давесці выпуск прадукцыі першага гатунку да 99,6 працэнта. Аўтазаводцы ўзялі абавязацельства павялічыць у параўнанні з мінулым годам аб'ём вытворчасці на 17,7 працэнта, прадукцыйнасць працы — на 9 працэнтаў, датэрмінова вырабіць доследны ўзор 120-тоннага аўтапоезда. Калектыў завода аўтаматычных ліній вырашыў гадавы план выканаць да 25 снежня, павысіць прадукцыйнасць працы на 7,3 працэнта і ўсю новую прадукцыю выпускаць на ўзроўні лепшых сусветных узораў.

У абавязацельствах перадавых калектываў прадугледжаны павышэнне надзейнасці і даўгавечнасці, зніжэнне сабекошту прадукцыі, атрыманне звышпланавага прыбытку, эканомія сродкаў і матэрыялаў, паляпшэнне ўмоў працы і быту працуючых, будаўніцтва жылля, дзіцячых устаноў і дамоў адпачынку.

Каштоўны пачын перадавых прадпрыемстваў знаходзіць шырокую падтрымку сярод працаўнікоў сельскай гаспадаркі і іншых галін рэспублікі. Калгасы і саўгасы Карэліцкага раёна абавязаліся за кошт актыўнага ўкаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту, комплекснай механізацыі і больш поўнага выкарыстання унутраных рэзерваў і магчымасцей павысіць у параўнанні з 1968 годам прадукцыйнасць працы ў сельскай гаспадарцы на 20 працэнтаў, дабіцца ўраджайнасці збожжавых з кожнага гектара—20 цэнтнераў, цукровых буракоў—320 цэнтнераў і льновалакна—6,5 цэнтнераў; давесці надой малака ад каровы да 2.560 кілаграмаў і атрымаць яго ў разліку на сто гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў па 440 цэнтнераў і мяса—па 90 цэнтнераў.

Ударная ленінская вахта, пачатая перадавымі калектывамі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў рэспублікі, з'яўляецца важным фактарам павышэння эфектыўнасці грамадской вытворчасці і ўздыму дабрабыту народа. Яна адкрывае новую слаўную старонку ва ўсенародным сацыялістычным спаборніцтве за датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі і дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна.

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі адабрае ініцыятыву калектываў Мінскага трактарнага і Беларускага аўтамабільнага заводаў, Віцебскага дывановага камбіната, завода «Гомсельмаш» і Мінскага завода аўтаматычных ліній, калгасаў і саўгасаў Карэліцкага раёна, горача вітае іх імкненне азнаменаваць 1969 год і надыходзячы ленінскі юбілей ударнай работай, новымі выдатнымі здзяйсненнямі ў камуністычным будаўніцтве.

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі выказвае ўпэўненасць, што высакародны пачын вядучых калектываў прамысловасці і сельскай гаспадаркі будзе падхоплен усімі працоўнымі рэспублікі; бягучы і завяршаючы гады пяцігодкі стануць перыядам узорнай ударнай работы ўсіх звёнаў народнай гаспадаркі і культуры, праяўлення ў кожным працоўным калектыве, на кожным рабочым месцы ініцыятывы і творчасці, пошукаў і наватарства, высокай дзелавітасці, арганізаванасці і дысцыпліны.

Абавязак работнікаў прамысловасці, транспарту і будаўніцтва, працаўнікоў вёскі, іншых галін народнай гаспадаркі—па прыкладу ініцыятараў спаборніцтва і абапіраючыся на тэхнічны прагрэс, рашуча палепшыць выкарыстанне вытворчых фондаў і капітальных укладанняў, арганізацыю працы і вытворчасці, дабівацца скарачэння затрат сродкаў і матэрыялаў, няўхільна павялічваць выпуск, павышаць якасць, зніжаць сабекошт прадукцыі, актыўна ўкараняць у практыку перадавы вопыт.

Работнікі гандлю, камунальнай гаспадаркі і бытавога абслугоўвання закліканы значна павысіць узровень работы магазінаў, сталовых і буфетаў, гарадскога транспарту, усіх прадпрыемстваў па абслугоўванню працоўных.

ЦК КП Беларусі спадзяецца, што дастойны ўклад да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна ўняцуць дзеячы навукі і культуры, наша працоўная інтэлігенцыя, усе работнікі разумовай працы, што яны будуць і ў далейшым аддаваць свае сілы і веды вялікай справе камуністычнага будаўніцтва, з высокім натхненнем і настойлівасцю развіваць навуку і тэхніку, ствараць новыя яркія творы літаратуры і мастацтва, несці сацыялістычную культуру ў масы, дапамагаць выхоўваць падрастаючае пакаленне ў духу камунізма.

Злітыя разам намаганні рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі рэспублікі, натхнёных высакароднай мэтай—вучыцца жыць, працаваць і перамагаць па-ленінску, паслужаць магутным фактарам нашага далейшага эканамічнага і культурнага росту, датэрміновага выканання заданняў пяцігодкі, паспяховага ажыццяўлення рашэнняў XXIII з'езда КПСС, што з'явіцца нашым дастойным адказам на высокую ўзнагароду Радзімы — ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі, якога ўдастоена Беларуская ССР у дзень яе слаўнага 50-годдзя.

Цэнтральны Камітэт КПБ лічыць важнейшым абавязкам партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый усямерна падтрымаць пачынанне калектываў, якія сталі на ўдарную ленінскую вахту, уцягваць у патрыятычны рух усе новыя і новыя атрады працоўных, зрабіць яго сапраўды ўсенародным. Абкомы, гаркомы, райкомы КПБ, міністэрствы і ведамствы БССР, усе партыйныя, дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, гаспадарчыя кіраўнікі абавязаны ў сваёй практычнай дзейнасці няўхільна выконваць ленінскія нормы і патрабаванні, пастаянна ўдасканальваць арганізатарскую і палітычную работу ў масах і метады свайго кіраўніцтва. Яны закліканы забяспечыць самыя спрыяльныя ўмовы для выканання прынятых сацыялістычных абавязацельстваў калектывамі працоўных і кожным работнікам у паасобку.

ЦК Кампартыі Беларусі лічыць неабходным, каб у бліжэйшы час на кожным прадпрыемстве і будоўлі, у калгасе і саўгасе, ва ўстанове навукі і культуры, ва ўсіх арганізацыях і ведамствах, у кожнай пярвічнай партыйнай арганізацыі былі прадуманы канкрэтныя меры паляпшэння сваёй дзейнасці, укаранення ў практыку ўсяго новага, прагрэсіўнага, што нараджаецца ў ходзе ажыццяўлення рашэнняў XXIII з'езда КПСС і пяцігадовага плана.

Рэдакцыям рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх і раённых газет, Дзяржаўнаму камітэту Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанні і тэлебачанні, прапагандыстам, палітінфарматарам, усім ідэалагічным установам і арганізацыям неабходна ўзмацніць прапаганду і пашырэнне лепшых узораў ударнай работы, вопыту перадавікоў і наватараў вытворчасці, шырока асвятляць ход сацыялістычнага спаборніцтва за дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Для савецкага чалавека не можа быць вышэйшага гонару, чым працаваць па-ленінску, з ленінскай перакананасцю, дзелавітасцю, мэтанакіраванасцю.

Няхай работа па-ленінску стане дэвізам і нормай жыцця ўсіх працоўных калектываў, усіх арганізацый і ведамстваў, кожнага працаўніка горада і вёскі!

Няхай у кожным кроку нашай работы, у яе выніках увасабляецца ленінскае ўказанне: не супакойвацца на дасягнутым, дабівацца абавязкова большага, абавязкова лепшага!

Няхай уся наша практычная дзейнасць будзе азорана творчым гарэннем, адзначана пастаянным пошукам новых шляхоў няўхільнага руху наперад, да новых поспехаў у камуністычным будаўніцтве!

НОВЫЯ НАРОДНЫЯ

За дасягнутыя творчыя поспехі ў развіцці харавога мастацтва і актыўную канцэртна-выканаўчую дзейнасць прэзідыум Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў прысвоіў ганаровы званні народных харавой капэле Віцебскага медінстытута і вакальнаму ансамблю Полацкага завода шкловалакна.

Народная харавая капэла Віцебскага медыцынскага інстытута (мастацкі кіраўнік Ю. Гразноў) была створана ў канавіку 1963 года. Спачатку калектыў аб'ядноўваў не больш 20 чалавек, у рэпертуары яго пераважалі беларускія і рускія народныя песні. З кожным годам калектыў рос, у настойлівай вучобе павышаў сваё выканаўчае майстэрства. У 1966 годзе ён налічваў ужо 80 чалавек. У яго рэпертуары з'явіліся творы класікі і сучасных беларускіх, рускіх і зарубежных кампазітараў. Добра паказалі сябе ў гэты час мужчынская і жаночая вакальныя групы, трыо і дуэты капэлы.

Харавая капэла прымала ўдзел у рэспубліканскім і ўсесаюзным фестывалях самадзейнага мастацтва, прысвечаных 50-годдзю Вялікага Кастрычніка і ўдастоена ганаровых грамат і дыпломаў. Асаблівага творчага ўзлёту і актыўнай канцэртнай дзейнасці дасягнуў калектыў у перыяд падрыхтоўкі і святкавання 50-годдзя БССР і КПБ.

Народны мужчынскі вакальны ансамбль Полацкага завода шкловалакна быў створаны ў 1958 годзе. У яго склад уваходзіць шмат перадавікоў вытворчасці, ударнікаў камуністычнай працы. Калектывам кіруе памочнік майстра ткацкага цэха А. Конюхаў.

Рэпертуар ансамбля багаты і разнастайны — ад беларускіх народных песень і песень беларускіх кампазітараў — да класічных твораў рускіх і зарубежных кампазітараў у тым ліку такіх складаных, як хор «Ночанька» з оперы А. Рубінштэйна «Дэман».

Калектыў — часты госць у рабочых прадпрыемстваў Полацка, Віцебска і іншых гарадоў, у сельскіх працаўнікоў Віцебшчыны. Яго неаднаразова адзначалі за актыўную шэфскую работу. Ансамбль з'яўляецца дыпламантам Усесаюзнага фестывалю мастацкай самадзейнасці, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады. Ён удзельнічаў на заключным канцэрце Рэспубліканскага агляду мастацкай самадзейнасці, прысвечаным 50-годдзю БССР і КПБ, дзе яшчэ раз з гонарам адстаяў сваю славу.

ІМЁНЫ МАЛАДЫХ НА АФІШАХ

Вынікі тэатральнага фестывалю, прысвечанага 50-годдзю ВЛКСМ

Калегія Міністэрства культуры БССР, бюро ЦК ЛКСМБ, прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры і прэзідыум Беларускага тэатральнага аб'яднання падвялі вынікі тэатральнага фестывалю, прысвечанага 50-годдзю Ленінскага камсамола.

У пастанове адзначаецца, што творчыя калектывы рэспублікі падрыхтавалі да юбілею камсамола новыя пастаноўкі (Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Яні Купалы, Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя ЛКСМБ, Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача, Гродзенскі абласны драматычны тэатр), а таксама паказалі маладзёжныя спектаклі свайго бягучага рэпертуару. Тэта былі спектаклі на сучасную і гісторыка-рэвалюцыйную тэму.

Тэатры і абласныя камісіі па правядзенні фестывалю арганізавалі справу так, што на прагледах гэтых спектаклеў пабывалі камсамольцы і моладзь гарадоў і сёл нашай рэспублікі. Наладжваліся сустрэчы творчых калектываў з інтэлігенцыяй і навучэнцамі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, прадстаўнікамі фабрык і заводаў. Тэатральная моладзь актыўна ўдзельнічала ў правядзенні агляду калектываў мастацкай самадзейнасці, у арганізацыі ўрачыстых вечароў, прысвечаных 50-годдзю камсамола.

У адпаведнасці з рашэннем рэспубліканскай камісіі тэатральнага фестывалю калегія Міністэрства культуры БССР, бюро ЦК ЛКСМБ, прэзідыум БРК прафсаюза работнікаў культуры і прэзідыум Беларускага тэатральнага аб'яднання вырашылі рэкамендаваць для прагляду цэнтральнай камісіі спектаклі «Гросмайстарскі бал» І. Штэмлера (Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), «Дзеці аднаго дома» І. Шамякіна (Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача) і «Людзі і комні» К. Губарэвіча (Брэсцкі абласны тэатр імя ЛКСМБ).

Лепшыя маладыя акцёры, рэжысёры і мастакі, а таксама лепшыя арганізатары тэатральнага фестывалю ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры, Ганаровымі граматамі ЦК ЛКСМБ і творчымі камандзіроўкамі ў Масву і Ленінград.

Ганаровымі граматамі ЦК ЛКСМБ узнагароджаны Л. Валчэцкі, Г. Волкаў, Ю. Уласаў і С. Яўдошанка (Брэсцкі абласны тэатр імя ЛКСМБ), Н. Левашова, Л. Кавалёў і А. Салаўёў (Беларускі дзяржаўны тэатр імя Якуба Коласа), Б. Ганага, Л. Горцава і В. Кліменка (Беларускі дзяржаўны тэатр юнага гледача), І. Шыкунова (Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета), Я. Дашкоў і Ж. Заромба (Гомельскі абласны драматычны тэатр), Т. Нікалаева (Гродзенскі абласны драматычны тэатр).

Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры ўзнагароджана 13 чалавек: А. Памазан і У. Рагаўцоў (Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Яні Купалы), М. Грышчанка (Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета), Л. Былінская і Н. Чамадурава (Дзяржаўны тэатр імя М. Горкага), М. Патапчук і З. Паўлоўская (Беларускі дзяржаўны тэатр юнага гледача), Г. Баравік і Т. Камбурава (Брэсцкі абласны драматычны тэатр імя ЛКСМБ), М. Апёк і М. Малахаў (Гродзенскі абласны драматычны тэатр), Л. Гарбунова і У. Ткачэнка (Гомельскі абласны драматычны тэатр).

ЛЕНІНСКІЯ МУЗЕІ І ПАКОІ

Дзейсную падрыхтоўку да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна разгарнулі работнікі культасветустаноў Віцебскай вобласці. У гэтыя дні ў Палацы культуры наваполацкіх нафтавікоў абсталяваны новы ленінскі пакой. У ім сабраны бессмяротныя творы Ільіча, успаміны старых бальшавікоў — паплечнікаў У. І. Леніна, грамафонныя пласцінкі з запісам прамоў правадыра рэвалюцыі. У пакоі ёсць рэпрадукцыі карцін, ленінскія партрэты, скульптуры. Асобнае месца тут займае вялікі дыван віцебскіх майстроў ткацтва з вобразам дарагога Ільіча.

Ленінскія пакоі і кутні абсталёўваюцца ў Оршы, Чашніках, Бешанковічах, Талачыне, Шклове.

У школах Мазырскага раёна за апошні час створана сем музеяў Ільіча, стэнды якіх расказваюць пра палымяннае жыццё, рэвалюцыйную і дзяржаўную дзейнасць заснавальніка Савецкай дзяржавы.

З Ільічом у сэрцы

Так называецца фотавыстаўка, што адкрылася ў Валожынскім раённым доме культуры. На ёй прадстаўлена больш як сто работ фотааматараў Валожынскага, Мядзельскага і Вілейскага раёнаў. Большасць з іх прысвечана прадстаўнікам старой ленінскай гвардыі, удзельнікам Кастрычніцкай рэвалюцыі, людзям, якім пашчасціла бачыць і чуць Ільіча, а таксама ветаранам вайны і працы, тым, хто па ленінскіх запаветах ператварае жыццё на нашай зямлі. Экспанаты выстаўкі шырока адлюстроўваюць мірныя будні працоўных рэспублікі, паказваюць тыя вялізныя змены, што адбыліся на Беларусі.

УСПАМІНЫ СТАРЫХ БАЛЬШАВІКОЎ

Піліп Сцяпанавіч Замойскі быў дэлегатам другога і трэцяга з'ездаў Саветаў. У свой час яму давялося працаваць у Саўнаркоме побач з Уладзімірам Ільічом Леніным. Па просьбе работнікаў Дзяржаўнага архіва г. Пінска стары бальшавік запісаў свае ўспаміны аб незабыўных сустрэчах з Ільічом. Хутка гэты дакумент зойме адно з ганаровых месц на стэндах, прысвечаных 100-гадоваму юбілею У. І. Леніна.

Да гэтай знамянальнай даты ў жыцці нашага народа архіўныя работнікі Пінска падрыхтавалі ўжо некалькі стэндаў. У старажытным беларускі горад даслалі свае матэрыялы музеі Ульянаўска, Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў.

Вялікую цікавасць уяўляе сабой стэнд, матэрыялы якога расказваюць пра тое, як ва ўмовах жорсткага буржуазнага рэжыму былой панскай Польшчы працоўныя Заходняй Беларусі адзначалі 60-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна.

РАСКАЗВАЕ МУЗЫКАЗНАЎЦА

«Лейін і музыка» — так называлася лекцыя музыказнаўцы Беларускай дзяржаўнай філармоніі Л. Аўэрбаха, яную ён прачытаў для мінскіх настаўнікаў музыкі і спеваў — удзельнікаў нарады, прысвечанай падрыхтоўцы школ да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча.

Удзельнікі нарады абмяняліся вопытам падрыхтоўкі да знамянальнага юбілею і вырашылі вывучыць у сталічных школах новыя песні пра Ільіча, а таксама тыя творы, якія ён любіў.

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ГЕНІЮ РЭВАЛЮЦЫІ

Як да вялікага свята рыхтуюцца да ленінскага юбілею хлебаробы Любаншчыны. У многіх калгасах і саўгасах тут адкрыты выстаўкі літаратуры, плакатаў і дакументаў на ленінскую тэматыку. Яны расказваюць наведвальнікам пра тое, як увасабляюцца ў жыцці ленінскія запаветы, якія змены адбыліся на Палессі за гады Савецкай улады.

Цікавы вечар, прысвечаны Уладзіміру Ільічу Леніну, адбыўся ў саўгасе «10 год БССР». Прысутныя з вялікай увагай праслухалі лекцыю аб жыцці і дзейнасці Ільіча, прагледзелі выступленне мясцовых самадзейных артыстаў-спеваноў, танцораў, дэкламатараў. Удзельнікі вечара пазнаёміліся з творамі У. І. Леніна, якія ладабралі для іх работнікі бібліятэкі, а таксама з выстаўкай кніг беларускіх пісьменнікаў пра Ільіча.

У ТЫЯ ДНІ

45 год мінула з таго часу, як зроблены гэтыя здымкі. Але яны і зараз жыва напамінаюць нам падзеі тых незабыўных дзён.

Глыбокім болем ва ўсіх кутках краіны адгукнулася ў людскіх сэрцах смерць Уладзіміра Ільіча Леніна. У жалобу апрануліся гарады і сёлы. Рабочыя і сяляне збіраліся на мітынгі і дэманстрацыі, каб аддаць даніну павагі і шчырай любві вялікаму правадыру.

Вось і на гэтых здымках вы бачыце такія мітынгі. На першым фотаздымку—жыхары гор. Навазыбкава (тады ён уваходзіў у склад Гомельскай губерні) у дзень пахавання У. І. Леніна. На другім здымку—жалобная працэсія сялян мястэчка Сямёнаўка Навазыбкаўскага павета 24 студзеня 1924 года.

Здымкі захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве кіна- фота- фонадакументаў БССР.

ЛЯ ВЫТОКАЎ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ

ДАСЛЕДЧЫКІ ленінскай творчай спадчыны ўжо даўно звярнулі ўвагу на адну дэталь: у творах Леніна, яго пісьмах да родных і знаёмых даволі часта сустракаецца слова «бібліятэка». Ды і ў памяці людзей, якія добра ведалі Леніна, захаваліся эпізоды, якія паказваюць, што Ільіч — куды б ні закідаў яго лёс — заўсёды шукаў «сустрэч» з бібліятэкамі, рэгулярна працаваў у іх.

У гімназічныя і студэнцкія гады Уладзімір Ульянаў — чытач Карамзінскай грамадскай бібліятэкі ў Сімбірску, універсітэцкай і гарадской бібліятэк у Казані, карыстаўся фондамі Самарскай публічнай бібліятэкі, з верасня 1893 па снежань 1895 года рэгулярна наведваў Публічную бібліятэку ў Пецярбургу, карыстаўся бібліятэкай Вольнаэканамічнага таварыства, наведваў чытальню пры кнігарні газеты «Новости» на Вялікай Марской вуліцы...

Па дарозе да месца ссылкі 27-гадовы Ленін пражыў з 4 сакавіка па 30 красавіка 1897 года ў Краснаярску. Ён не траціў часу і тут наведваў бібліятэку Юдзіна.

За мяжой Ленін займаецца ў буйнейшых кнігасховішчах. У 1895 годзе, аказаўшыся упершыню за мяжой, ён тыдні два жыве ў Берліне і займаецца ў імператарскай бібліятэцы. Вядома заява У. І. Леніна, напісаная ім 21 красавіка 1902 года на імя дырэктара Брытанскага музея ў Лондане:

«Звяртаюся да вас з просьбай аб выдачы мне білета на права ўваходу ў чытальную залу Брытанскага музея. Я прыбыў з Расіі для вывучэння аграрнага пытання. Прыкладаю рэкамендацыйнае пісьмо м-ра Мітчэла».

Падлічана, што за сваё жыццё Ленін быў чытачом больш чым сарака буйных кнігасховішчаў і бібліятэк Расіі і Заходняй Еўропы. Ён займаўся ў бібліятэках Англіі, Аўстрыі, Германіі, Францыі, Швецыі, Швейцарыі.

Ленін быў не проста чытачом, ён вывучаў формы і метады абслугоўвання чытачоў, сістэму расстаноўкі і хавання кніг, арганізацыю бібліятэчных каталогаў. Па тым,— пісала Н. К. Крупская, — як наладжана бібліятэчная справа, меркаваў Ільіч аб узроўні культуры, стан бібліятэчнай справы быў для яго паказчыкам агульнай культурнасці.

Але пройдуць гады напружанай барацьбы Леніна, партыі бальшавікоў з царскім самадзяржаўем, адбудзецца Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, перш чым з'явіцца тэрмін — «савецкае бібліятэказнаўства».

Ёсць і ў Ленінградзе дзве бібліятэкі, гісторыя якіх цесна звязана з імем Леніна. Яны былі буйнейшымі культурнымі ачагамі Расіі, ім жа суджана было пры актыўным садзеянні Леніна адыграць выдатную ролю ў развіцці савецкай бібліятэчнай справы.

У 1891 і 1894 гадах малады Ленін займаўся ў бібліятэцы Акадэміі навук у Пецярбургу. Раней сюды прыходзіў яго брат-студэнт Аляксандр Ульянаў, пакараны смерцю царскім самадзяржаўем. У графе, прызначанай для запісу роду заняткаў чытача, ленінскай рукой напісана: «Палітычная эканомія і статыстыка»... У гэтым буйнейшым кнігасховішчы Расіі Ільічу давялося бываць і трохі пазней.

У перыяд першай рускай рэвалюцыі сюды пачалі паступаць пасылкі з-за граніцы з літаратурай, забароненай у царскай імперыі. Імкнучыся стварыць у Расіі фонд партыйнай літаратуры, Ленін настойліва рэкамендаваў усім камітэтам партыі ў краіне, а таксама замежным арганізацыям партыі прысылаць у бібліятэку Акадэміі навук нелегальную літаратуру.

Вось як піша аб гэтым У. Бонч-Бруевіч, які сустракаўся з Леніным у 1907 годзе ў Куокала (пад Пецярбургам) і паведаміў Леніну аб арганізацыі ў бібліятэцы Акадэміі навук аддзела нелегальнай літаратуры:

«Ён да гэтага прадпрыемства паставіўся ў вышэйшай ступені спачувальна, адразу ж пазваў Надзежду Канстанцінаўну і прасіў яе пры ўсіх сувязях з арганізацыямі абавязкова ўказваць, каб усе нелегальныя выданні, якія выходзілі ўсюды, накіроўваліся б у двух экземплярах, у заказных пакетах, у адрас рукапіснага аддзялення бібліятэкі Акадэміі навук. Ён сам падабраў усё, што ў яго было пад рукамі, і перадаў мне як свой уклад у гэты аддзел».

Ленін і ў другой эміграцыі не забыў на сваё абяцанне дапамагаць аддзелу нелегальнай літаратуры рукапіснага аддзялення бібліятэкі Акадэміі навук. З Фінляндыі, Швейцарыі і іншых краін Еўропы ў бібліятэку прыходзілі пакеты і заказныя пісьмы з самымі рознымі рускімі выданнямі. Іх высылаў або Ленін, або таварышы, якіх ён увёў у курс справы.

Калі Ленін вярнуўся з эміграцыі пасля Лютаўскай рэвалюцыі, ён запытаўся ў Бонч-Бруевіча пра фонд нелегальных выданняў бібліятэкі Акадэміі навук. Аднойчы ён сам прыехаў у гэту бібліятэку, прабыў там больш як дзве гадзіны, агледзеў газетны і часопісны аддзелы.

У другой буйнейшай бібліятэцы Ленінграда — Публічнай імя Салтыкова-Шчадрына — ёсць чытальная зала, у якой, як гаворыць мемарыяльны надпіс: «... у 1893—1895 гг. займаўся Уладзімір Ільіч Ленін». Яго заняткі тут былі перапынены ў снежні 1895 года, калі ён быў арыштаваны царскай ахранкай па справе «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа». Больш Уладзімір Ільіч у гэтай бібліятэцы не бываў, але сувязей з ёй не парываў.

Нават у самыя напружаныя дні Кастрычніцкага ўзброенага паўстання Ленін не забыў пра бібліятэку. У наступную пасля ўзяцця Зімняга палаца ноч ён сказаў толькі што прызначанаму камісару па асвеце Луначарскаму:

— Пастарайцеся звярнуць у першую чаргу ўвагу на бібліятэкі... Хутчэй трэба зрабіць кнігу даступнай масе... Нашу кнігу трэба пастарацца кінуць у магчыма большай колькасці і ва ўсе канцы Расіі.

У першыя ж дні Кастрычніцкай рэвалюцыі Ленін піша запіску «Аб задачах Публічнай бібліятэкі ў Петраградзе». Гэты дакумент стаў праграмным для ўсіх савецкіх бібліятэк. Ленін пісаў аб неабходнасці зрабіць багацейшыя кніжныя фонды «даступнымі для масы, для натоўпу, для вуліцы», каб «нават дзеці маглі карыстацца багатымі калекцыямі кніг».

■

У кожным горадзе, у кожным сяле Савецкага Саюза ёсць сёння выдатныя бібліятэкі. Яны ёсць на заводах і фабрыках, у школах і ву, навукова-даследчых арганізацыях, у палацах культуры і сельскіх клубах.

У спецыялізаваных інстытутах рыхтуюцца высокакваліфікаваныя кадры бібліятэчных работнікаў.

Савецкая бібліятэчная справа, ля вытокаў якой стаяў Ленін, служыць народу.

Аўтаром НЯПОМНЯШЧЫ,
карэспандэнт АДН.

НАТХНЁНЫЯ ВЕЛІЧНЫМ ВОБРАЗАМ

Беларускія мастакі напружана працуюць над новымі карцінамі, скульптурамі, графічнымі лістамі, прысвечанымі Ільічу і яго саратнікам.

Жывапісец Л. Шчэмелеў працуе над кампазіцыяй «Ленін і Дзяржынскі». Правадыр рэвалюцыі і «жалезны Фелікс» будуць паказаны ў час гутаркі. Дзеянне твора адбываецца ў цяжкія для краіны першыя паслярэвалюцыйныя гады.

Вялікай дружбе Уладзіміра Ільіча з Горкім прысвячае сваю новую скульптурную кампазіцыю А. Анікейчык. Яна называецца — «Ленін і Горкі на Капры».

Манументальная кампазіцыя, прысвечаная Леніну, задумана жывапісцам І. Ціханавым. Ільіч будзе адлюстраваны тут на ўвесь рост на фоне палымнеючага сонца.

В. Вярсоцкі нядаўна наведаў ленінскія мясціны ў Англіі. Да ўрачыстай ленінскай даты ён мяркуе стварыць серыю жывапісных пейзажаў, прысвечаных гэтым мясцінам.

Завяршылі работу над праектам помніка Уладзіміру Ільічу Леніну для горада Лепеля скульптары Б. Івонцьеў, І. Глебаў і архітэктар Ю. Казакоў. Помнік будзе ўстаноўлены ў Лепелі напярэдадні слаўнай даты.

Шмат працуе над вобразам Леніна і ленінцаў графік М. Жытніцкі. У фае кінатэатра «Беларусь» экспануецца невялікая выстаўка яго твораў, сярод якіх лісты «Ленін сярод чырвонагвардзейцаў», «Яны былі першыя» (твор, прысвечаны М. Фрунзе і А. Мясникову). Цяпер мастак працуе над новай серыяй графічных лістоў пра Леніна і ленінцаў. У серыю ўвойдзе каля дзесяці работ.

На рэспубліканскай мастацкай выстаўцы «50 год БССР і КПБ» экспануецца работа скульптара А. Заспіцкага «Ф. Э. Дзяржынскі». Мастак працягвае работу над гэтым вобразам, і на выстаўцы, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Ільіча, мы ўбачым новую скульптуру А. Заспіцкага, прысвечаную вернаму ленінцу, рыцару рэвалюцыі.

Прыгаданымі прыкладамі не вычэрпваюцца задумы беларускіх мастакоў да слаўнай даты. Але і яны сведчаць, што ўжо ідзе натхнёная, напружаная праца.

ПОШУК, ЯКОМУ НЯМА КАНЦА

А. ЛОГІНАЎ,
народны артыст БССР

ПЕРАДА мной чысты ліст паперы. Я сяджу за сталом, бяруся за ручку, але адкладваю... Думаю. Доўга думаю — шукаю першую фразу размовы пра Уладзіміра Ільіча, над стварэннем сцэнічнага вобраза якога працую ўжо некалькі гадоў.

І вось, здаецца, фраза знойдзена: мой Ленін... Я раскажу аб сваім Леніне, якога хачу сыграць, а ці сыграю — не ведаю.

Мая першая на сцэне сустрэча з вобразам Леніна (ролю яго іграў мой калега Павел Іосіфавіч Вінаградаў) адбылася ў Брэсцкім тэатры імя ЛКСМБ у спектаклі «Фінал». Я іграў Міхаіла Васільевіча Фрунзе, ролю складаную і адказную, і мяне па-чалавечы і па-акцёрску вельмі хвалявалі мае сцэны з Леніным. Я лавіў кожнае слова акцёра, і было такое адчуванне, нібы перада мной жывы Ільіч. І зусім не таму, што выканаўчае майстэрства акцёра было такое ўжо дасканалае, — не, але маё ўяўленне ўваскрашала ў памяці мноства дэталяў, знаёмых па ўспамінах сучаснікаў, кнігах і кінафільмах, дамалёўвала вялікі вобраз — і я выходзіў на сцэну цалкам ва ўладзе яго абаяльнасці, сілы, геніяльнасці...

Зараз цяжка сказаць, чаму менавіта мне прапанавалі сыграць Леніна ў п'есе М. Шатрова «Дзень цішыні». Можа Георгій Андрэевіч Волкаў — наш галоўны рэжысёр — заўважыў маю захопленасць гэтым вобразам?.. Тады я яшчэ не думаў, што не змагу ўжо жыць спакойна, што ўсё маё жыццё пацячэ інакш і я буду думаць і думаць аб ім, учытвацца ў кожны ленінскі радок, каб пакцёрску наблізіцца да разумення гэтага незвычайнага чалавека.

У маім рэпертуары — дон Сезан дэ Базан, Атэла, Арбенін... Сыграць гэтыя ролі — мара кожнага акцёра, і я мог бы быць задаволены сваім лёсам. І ўсё-такі мой акцёрскі багаж аказаўся вельмі малым, калі я пачаў працаваць над вобразам У. І. Леніна. На першым часе атрымлівалася, што я ўсяго толькі больш-менш дакладна ўзнаўляў знешні воблік правадыра — некаторыя характэрныя яго позы, жэсты, інтанацыі. Увогуле, відаць, гэта — пошук, на які аднаго жыцця мала.

Калі гаварыць пра вобраз Леніна ў тэатры і кіно, звычайна пачынаюць з п'ес М. Пагодзіна і фільмаў М. Рома. Аўтары гэтых твораў ставілі перад сабой прынцыпова новую задачу — раскрыць унутраныя якасці ленінскага характару. Але перш, чым гэта стала магчымым, трэба было накапіць немалы вопыт.

Першыя спробы сцэнічнага ўвасаблення Леніна пачаліся яшчэ ў 1919 годзе ў Закаўказзі. Другая ранняя спроба была зроблена ў 1924 годзе, калі самадзейны калектыў ваеннай школы імя УЦВК паставіў спектакль па п'есе «Гібель самаўладдзя». Аўтарам п'есы і выканаўцам ролі Леніна быў Юрый Віктаравіч Тарыч, пазней вядомы беларускі кінарэжысёр. Аднак у гэтай п'есе, ды зрэшты і ў іншых спектаклях таго часу, перад гледачом Ленін паўставаў хутчэй як сімвал, а не жывы чалавек, сутнасць ленінскага вобраза заставалася нераскрытай.

Зараз сцэнічная Ленініяна ўжо мае пэўныя, трывалыя і цікавыя традыцыі. Гэта, у першую чаргу, глыбокі псіхалагізм. Безумоўна, ні адзін акцёр, які выконвае сёння ролю Леніна, не можа не лічыцца з вопытам, накопленым такімі выдатнымі выканаўцамі, як Шчукін, Штраух і Смірноў. Аднак механічнае паўтарэнне таго, што зроблена іншымі, асуджана на няўдачу, на правал.

Мне ўспамінаюцца словы Уладзіміра Ільіча Леніна, сказаныя ім у гутарцы з мастаком, які напісаў яго партрэт. Мастак цікавіўся, падобны ці не падобны Уладзімір Ільіч. Ленін паглядзеў на партрэт і сказаў: «Падобны то падобны, але Вас не відаць у гэтым малюнку». Мне здаецца, што ў гэтых словах — ключ да рашэння ленінскага вобраза. Прайшоў той час, калі ў пагоні за падабенствам роля Уладзіміра Ільіча даручалася людзям знешне падобным на Леніна. Сёння гэта ўжо не самае галоўнае, сёння перш за ўсё нас цікавіць глыбіня і шырыня ленінскай думкі, маштабнасць яго ідэй, філасофскае асэнсаванне свету.

І вось я, як і іншыя выканаўцы вобраза правадыра, спрабую зразумець прыроду яго розуму, зразумець, якія рысы характару Ільіча зрабілі яго недасягальна вялікім і такім даступным і любімым для кожнага.

Чым больш я знаёміўся з літаратурай, слухаў грамзапісы ленінскіх прамоў, глядзеў дакументальныя кадры, тым больш і больш разумеў, што трэба старацца сыграць не ў с я г о Леніна, а толькі якую-небудзь грань, якую-небудзь частку яго складанага, непаўторнага і вялікага характару. У гэтым пераконваў і вопыт акцёрскіх работ Шчукіна, Штрауха, Смірнова І, нарэшце, Каюрава ў кінафільме «Шостае ліпеня». Так, Штраух узбагаціў Ленініяну, стварыў характар інтэлектуальны, ён іграў чалавека думаючага, пястомна думаючага. А. Смірноў імкнуўся стварыць вобраз Леніна рамантычнага і на рэдкасць душэўнага.

У той жа час я пераконваўся, што толькі той мастак можа хоць бы часткова зразумець глыбінны характар правадыра, хто здолее злучыць у адно гістарычную сутнасць яго характару і яго індывідуальныя рысы. Тут, мне здаецца, дарэчы будзе ўспомніць дакументальную драму «Шостае ліпеня». У самыя трагічныя мінуты, калі эсэры ўзяліся за зброю, здрадзілі рэвалюцыі, Ленін, які вымушаны сказаць рашучае: «Бязлітасны агонь» — застаецца чалавекам да канца, устрывожаным неабходнасцю кровапраліцця, нават калі яно справаджвана ворагам.

Мне давялося працаваць над вобразам Уладзіміра Ільіча Леніна ў трох п'есах: «Дзень цішыні» М. Шатрова, «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна і «Брэсцкі мір» К. Губарэвіча. З экземплярам п'есы, над якой ішла работа, я не расставаўся ні на хвіліну. Іншы раз думкі прыходзілі нечакана — на якім-небудзь сходзе або проста на вуліцы, і тады я даставаў п'есу і тут жа запісваў на палях, а, перачытваючы гэтыя паметкі на рэпетыцыі, як бы настройваў сябе, стараўся не здрабняцца, па меры сваіх здольнасцей думаць аб'ёмна. У рабоце над п'есай «Дзень цішыні» я ўвесь час памятаў словы Надзежды Канстанцінаўны Крупскай: «У эміграцыі харчаваўся дрэнна і вельмі абнасіўся. Яго мучылі галаўныя болі і бяссонніца, але Ленін не скардзіўся».

Стварэнне сцэнічнага вобраза Леніна ўскладняецца яшчэ тым, што Ленін вельмі блізкі і любімы для кожнага, ён — наш сучаснік. Пра Леніна, пра с в а й г о Леніна раскажа вам кожны школьнік. Ленінскі вобраз кожны чалавек у розны час уяўляе сабе па-рознаму. Мне расказваў адзін скульптар, што яшчэ да вайны ён стварыў скульптурны партрэт Леніна. Цаной неверагодных намаганняў, рызыкуючы жыццём, ён захаваў скульптуру ў гады акупацыі. А ўжо пазней, пасля вайны, начыста перарабіў партрэт, таму што ўяўляў сабе правадыра зусім іншым.

З такім стаўленнем да ленінскага вобраза мне давялося сутыкнуцца ў час работы. На першых прагонах «Брэсцкага міру» прысутнічала некалькі гледачоў, і яны рашуча заявілі, што не хочуць бачыць т а к о г а Леніна — я рабіў яго крыху стомленым. Так, яны разумеюць: Леніну ў барацьбе за Брэсцкі мір было вельмі нялёгка, ён не спаў начамі, ён цяжка перажываў страту нядаўніх саратнікаў... І ўсё-такі гледачы не хочуць бачыць Леніна стомленым — галоўнае не ў гэтым.

Так, многае даводзіцца ўлічваць, аб многім думаць, калі працуеш над вобразам Леніна. І вобраз, які мне бачыцца, які я хацеў бы паказаць на сцэне — гэта перш за ўсё вобраз чалавека, які ў найскладанейшых гістарычных умовах робіць справу свайго жыцця — разам з паплечнікамі вырашае лёс Расіі і лёс рэвалюцыі, чалавека з пранікліва вострым розумам і на дзіва добрым гарачым сэрцам.

Не магу яшчэ не сказаць вось аб чым. Я акцёр, і для мяне рашаючую ролю адыгрывае той драматургічны матэрыял, які я атрымліваю. Гэтак жа, як і нам, акцёрам, драматургам мала ведаць гісторыю. Толькі тады п'еса і кожны вобраз стануць творам мастацтва, калі будуць асветлены талентам драматурга. Я не стану гаварыць аб п'есах М. Пагодзіна і М. Шатрова — аб іх нямала сказана і напісана. Я хачу сказаць некалькі слоў аб п'есе «Брэсцкі мір». Спачатку я сам ды і іншыя таварышы выказвалі думку, — маўляў, здорава, што з'явілася ў Беларусі с в а я п'еса з вобразам Уладзіміра Ільіча, а потым я зразумеў, што дзе б ні ставралася п'еса пра правадыра — заўсёды, усюды да яе будуць прад'яўляцца самыя высокія патрабаванні. І мне думаецца, што аўтару п'есы К. Губарэвічу, а разам з ім і нам, трэба яшчэ нямала папрацаваць.

Мне хочацца прывесці ў сувязі з гэтым словы С. Эйзенштэйна:

«Кожны рэвалюцыйна-біяграфічны фільм нароўні з імем правадыра, якому ён прысвечаны, павінен несці яшчэ нібы скрыты падзагаловак тэмы, якая найбольш выразна будзе гучаць праз паказ яго жыцця або праз вобраз яго характару».

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 16 студзеня 1969 года за актыўны ўдзел і дасягнутыя поспехі ў развіцці беларускай савецкай архітэктуры прысвоена ганаровае званне заслужанага архітэктара Беларускай ССР Аладаву Вальмену Мікалаевічу —дырэктару Беларускага дзяржаўнага інстытута па праектаванню прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання, Бакланаву Міхаілу Іванавічу — кіраўніку архітэктурна-канструктарскай майстэрні інстытута «Белдзяржпраект», Бенядзіктаву Георгію Міхайлавічу — кіраўніку архітэктурна-канструктарскай майстэрні інстытута «Белдзяржпраект», Гусеву Валянціну Іванавічу — загадчыку кафедры інтэр'ера і абсталявання Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, Ладыгінай Вользе Барысаўне — кіраўніку архітэктурна-канструктарскай майстэрні інстытута «Белдзяржпраект», Ліўшыцу Мордуху Насонавічу — галоўнаму архітэктару праекта інстытута «Белдзяржпраект», Парсаданаву Георгію Арцёмавічу — начальніку Упраўлення па справах будаўніцтва і архітэктуры выканкома Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных, Шпіту Юрыю Васільевічу — намесніку старшыні Дзяржаўнага Камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па справах будаўніцтва.

В. Аладаў.

М. Бакланаў.

Г. Бенядзіктаў.

В. Гусеў.

В. Ладыгіна.

М. Ліўшыц.

Г. Парсаданаў.

Ю. Шпіт.

Падзеі. Факты. Навіны

КУПАЛАЎЦЫ У КАЛГАСНІКАЎ

Калгас імя Чарняхоўскага Карэліцкага раёна мае вялікі прыгожы Палац культуры, на сцэне якога зручна выступаць любому прафесіянальнаму калектыву. У госці да калгаснікаў ахвотна прыязджаюць артысты мінскіх тэатраў.

Днямі тут адбылася сустрэча купалаўцаў з калгаснікамі. Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паказаў у Палацы культуры камедыю А. Макаёнка «Ляўоніха на арбіце». Шчырымі воплескамі ўзнагародзілі хлебаробы ўдзельнікаў гэтага цікавага спектакля.

А. РАНАЧ.

НЕЗВЫЧАЙНАЯ БІБЛІЯТЭКА

Яна знаходзіцца пры клубе вучэбна-вытворчага камбіната слепых. На яе паліцах вы не ўбачыце томікі кніг у мастацкіх вокладках з прыгожымі ілюстрацыямі. Бібліятэка складаецца з твораў мастацкай літаратуры, запісаных на магнітафонная стужцы.

У такім незвычайным «выданні» можна паслухаць творы класікаў рускай літаратуры А. Пушкіна, М. Лермантава, Л. Талстога, І. Тургенева, А. Чэхава, М. Горкага. Ёсць у бібліятэцы запісы твораў савецкіх пісьменнікаў К. Сімонава, Б. Палявога, В. Кажэўнікава і іншых.

Багата прадстаўлены ў магнітафонных запісах творы беларускіх пісьменнікаў — «Людзі на балоце» І. Мележа, «На ростанях» Я. Коласа, «Трывожнае шчасце» і «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, творы П. Броўкі, А. Кулакоўскага.

Зараз у гэтай незвычайнай бібліятэцы налічваецца 420 назваў мастацкай літаратуры, запісаных на магнітафонных стужках.

А. БЕНЯНСОН.

г. Барысаў.

«НЕСЦЕРКА» КРОЧЫЦЬ ПА ВЁСКАХ

Чацвёрты год кіруе самадзейным тэатральным калектывам Астрашыцка-Гарадзецкага Дома культуры студэнт-завочнік чацвёртага курса Ленінградскага інстытута культуры Міхаіл Няронскі. Пад яго кіраўніцтвам нядаўна самадзейныя артысты падрыхтавалі спектакль па п'есе В. Вольскага «Несцерка». Зала Дома культуры не змагла ўмясціць усіх жадаючых пабываць на прэм'еры, якая прайшла напярэдадні свяцкова. Гледачы горача апладзіравалі выканаўцу ролі Несцеркі настаўніку мясцовай школы Івану Іванавічу Шараговічу. Удала справіліся са сваімі ролямі Ніна Пазняк, Уладзімір Геронік і іншыя аматары сцэны.

Вялікую дапамогу у пастаноўцы спектакля аказала рэжысёр-кансультант Г. Уладамірская.

У бліжайшы час «Несцерку» змогуць паглядзець многія хлебаробы Мінскага раёна, у якіх пабываюць самадзейныя артысты.

Г. ЛЯНКЕВІЧ.

СРОДКАМІ МЕДАЛЬЕРНАГА МАСТАЦТВА

ПЕРАД Домам урада ў Мінску — славуты помнік Уладзіміру Ільічу Леніну, створаны Мацвеем Генрыхавічам Манізерам—народным мастаком СССР, заслужаным дзеячам мастацтваў БССР і УССР. Гэты помнік—адзін з лепшых у краіне. Яго аўтар на працягу ўсяго жыцця натхнёна працаваў над вобразам правадыра пралетарскай рэвалюцыі, першай у свеце сацыялістычнай краіны. М. Манізерам створаны помнікі Леніну ў Петразаводску, ва Ульянаўску, у Маскве ў Лужніках (гэты помнік экспанаваўся на Сусветнай выстаўцы ў Брусэлі), а таксама бюст-помнік бацьку Леніна — І. М. Ульянаву і бронзавая статуя маці Уладзіміра Ільіча — М. А. Ульянавай. А ў 1962 годзе ў залах Акадэміі мастацтваў СССР на IV выстаўцы твораў правадзейных членаў, ганаровых членаў і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі мастацтваў СССР упершыню былі паказаны дванаццаць памятных медаляў, прысвечаных жыццю і дзейнасці Уладзіміра Ільіча, створаных правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР М. Манізерам. Праз год яны былі выпушчаны ў свет Ленінградскім манетным двароам. Гэта вялікая падзея ў савецкім медальерным мастацтве.

Усе медалі вырашаны ў класічным стылі, невысокім рэльефам. Тэмы ўсёй серыі — крыніцы ленінізма, жыццё і дзейнасць Уладзіміра Ільіча, непераможнасць ленінскіх ідэй.

Маркс, Энгельс, Ленін... Бацькі і сям'я Уладзіміра Ільіча... Ленін—гімназіст... Ленін — студэнт... Ленін — заснавальнік «Іскры»... Ленін — правадыр Кастрычніцкай рэвалюцыі і Краіны Саветаў... Гэтыя і іншыя тэмы — у аснове серыі медаляў М. Манізера.

Прапануем увазе чытачоў пяць медаляў з гэтай серыі: трэці, чацвёрты, сёмы, дзевяты, адзінаццаты. Кожны з іх рэпрадуцыраваны з двух бакоў — ліцавога (уверсе) і адваротнага (унізе).

М. ТОЙБЕРМАН.

Фота аўтара.

Пра першую кніжку пісьменніка

ЧАЛАВЕК — ПРЫРОДА — МАШЫНЫ

ГОРНЫ майстар Васіль Казакоў, надзвычай патрабавальны да самога сябе, лагодны і спагадлівы да іншых, схільны да пастаяннага і паглыбленага самааналізу, ніяк не можа зразумець: адкуль бярэцца такія людзі, як шафёр Паўлоўскі, які кожны раз знаходзіць прычыны, каб высадзіць яго з кабіны і ўзяць іншага спадарожніка — зарабіць «няшчасны пятак»; альбо механік кар'ера Вінюкоў з яго манерай звяртацца да людзей абразліва, з лаянкай і пагрозамі; альбо загадчыца цэнтральнай лабараторыі Сцежкіна, якая ўпарта трымаецца за сваю нікому не патрэбную пасаду. «Отчего бы это, — размышлял Казаков, — никак не хочешь верить с чужих слов в духовную убогость какого-либо человека, пока сам не удостоверишься в этом — жестоко, получив рану?».

Гэтае пытанне яскравей, чым што-небудзь іншае, выяўляе духоўную сутнасць Казакова. Аб людзях ён мяркуе па сабе і без ўсялякага напружання душы ўзвышае іх да таго маральнага ўзроўню, на якім знаходзіцца сам. І яго недаўменне натуральнае, калі ён бачыць, што далёка не ўсе людзі такія. Але засмучае яго не сам па сабе гэты факт, а тое, што немагчыма пазбегнуць сутыкнення з такімі людзьмі.

Калі Вінюкоў у гарачыню пасылае палівальную машыну ў Мінск па нейкае начальства, Казакоў застаецца безуважным, хоць і разумее, што машына не прызначана і не прыстасавана для такіх мэт. Але вось ён бачыць, у якім пыле працуюць самазвалы. «Казаков почувствовал вдруг стыд перед собою, перед людьми, которые задыхались в своих жарких кабинах, и остановился в совершенном замешательстве. Он почувствовал вдруг всем своим существом, что желание избежать стычки с Винюковым, даже не стычки, а простого служебного разговора, эгоистично, что нет никакого оправдания невмешательству его в распоряжение механика».

Так пачынаецца канфлікт, нават барацьба, аб якой Казакоў і не думаў, лічачы ўсялякую падобную барацьбу «непрыемнай».

Хто ж такі Вінюкоў? О, гэты чалавек ведае сабе цану, «дельный мужик, цепкий», знаток машын, так сказаць, тэхнакрат. Машына — справа рук чалавечых. І, значыць, любоў да машыны не можа не азначаць і любві да яе стваральнікаў. А Вінюкоў? «Он был неплохим лекарем машин, но не от любви к технике, а от постоянного желания показать себя и при случае утереть вам нос». Такім чынам, маску тэхнакрата апранае на сябе эгаіст, які ўсю любоў пераносіць на самога сябе. Ці мог Казакоў не ўступіць з ім у барацьбу — той Казакоў, які першапрычыну радасці бачыў ва «установлении какого-то тончайшего родственного контакта между собою и своими людьми»?

«На войне я уяснил для себя, что право на жизнь надо завоевывать кулаками. Я научился беспощадности. Если мне дают в одно ухо, я бью в два; иногда я опережаю и бью первым. Ты должен поддерживать меня во всяком деле на карьере, — сказал Винюков, — иначе нас сомнут поодиночке. Потихоньку мы их научим правильно поступать и, — Винюков усмехнулся, — правильно думать... Кривоноса надо гнать, чтоб другим неповадно было...

— Как ты смеешь!.. — закричал вдруг Казаков. — Грязная, низкая душа!.. — Отдаваясь совсем этому своему чувству, Казаков говорил невпопад, бесконтрольно и совершенно безотчетно. — Пошел, пошел отсюда!..».

Адкуль гэта ўспышка ярасці ў чалавека мяккага, летуценнага, добрага? Вядома, тут закранута самае святое для яго — бязмежная і непаказная павага да людзей.

Засяроджана думаючы аб сабе, аб людзях, Казакоў прыходзіць да вываду — і не бяда, што выказваецца ён крыху наіўна: «...На доверительности и участии должны основываться взаимоотношения... тем более сейчас, в наше время, когда подозрительность и ненависть могут мгновенно погубить все живое на земле совершенно... Но всякий раз находился ему новый Винюков, покорить которого добротой и искренностью было едва ли возможно...» і таму: «Во времена, когда средства покорения природы развиваются скорее, чем совершенствуется сама живая душа, всякая бездеятельность оборачивалась преступлением».

Было б неразумна нагаданую сцэну ўясніць так, быццам Казакоў абрушваецца на свайго субяседніка выключна з меркаванняў, так сказаць, глабальнага маштабу — з пачуцця нянавісці да падпальшчыкаў новай вайны. Не, вядома. Але эгаіст Вінюкоў для Казакова — маленькая частачка таго зла, якое, узведзенае ў высокую ступень, можа знішчыць на планеце ўсе жывое. І гнеў Казакова гаворыць толькі аб тым, што ён, Казакоў, заўсёды настроены на вялікую небяспеку, што думка аб ёй ніколі не дае яму супакоіцца.

Канфлікт Казакова з Вінюковым — канфлікт гуманізму і антыгуманізму. Сілы, якія супрацьстаяць у гэтым канфлікце, не алегарычныя азначэнні дабра і зла, яны — жывыя людзі, іх можна любіць і ненавідзець.

Казакоў, праўда, раскрываецца болей ва ўнутраных маналогах, чым ва ўчынках. Аўтар здолеў пераканаць нас: для Казакова думаць — асалода, гэта яго стыхія. Думка для яго такая ж рэальнасць, як і яго работа. У. Кудзінаў дэманструе на старонках аповесці работу думкі свайго героя: «И думая обо всем этом, развивая свою мысль...», «он не торопился развивать свою мысль, опасаясь поспешного вывода...», «он вспомнил и сегодняшний свой день, когда удалось ему хорошо подумать и многое понять...» і г. д.

Магутны саюзнік Казакова ў барацьбе з Вінюковым — прырода. У аповесці «Падзел радасці» ёй аддадзена шмат цудоўных старонак, якія сведчаць аб зайздросным веданні У. Кудзінавым таямніц прыроды, жыцця дрэва, птушкі, звера і травінкі.

Для Казакова (і для У. Кудзінава, вядома) прырода — не сховішча ад гарадскога жыцця, а наш бліжэйшы родзіч, сусед па планеце, з якім мы павінны сустракацца па магчымасці часцей, каб не згубіць многіх харошых чалавечых якасцей, як губляе іх чалавек, што адгароджваецца ад іншых людзей. Безыменны герой апавядання «Гаючая траўка» гаворыць: «...Мне удалось за несколько дней доверительной жизни в лесу хорошо почувствовать сердцем возможность установления родственной связи меж человеком и природой — той связи, утрата которой считается сегодня самой горестной из всех утрат человечества».

Прырода адкрыта для ўсіх людзей — усім ўвогуле і кожнаму пасобку. І Казакоў робіць адсюль такі нечаканы і такі дакладны вывад: прырода — гэта тое, на чым можна праверыць чалавечнасць чалавека, яго душэўныя якасці, гэта своеасаблівы пароль, па якім пазнаюць адзін аднаго сапраўдныя людзі.

І вось што яшчэ важна: У. Кудзінаў і не думае супрацьпастаўляць прыроду машыннай цывілізацыі, што часам робяць некаторыя сённяшнія неарусаісты. Наадварот, на яго думку, духоўна сталы чалавек, прырода і машына могуць стварыць непарыўнае і гарманічнае адзінства. Чытаем у «Падзеле радасці»: «И долина пескариного ручья, окруженная лесистыми холмами, до этого тихая, будто бы безжизненная, с неуклюже покосившимися в трясине «зилами», комарами и белым светом робкой луны вдруг наполнилась ревом моторов, мелькающими огоньками подфарников, сразу сделалось вроде бы уютной и обжитой».

І ў цэнтры гэтага трыадзінага свету — чалавек, у дадзеным выпадку — горны майстар Васіль Казакоў, наш сучаснік. Многія рысы, якія складаюць гэты чалавечы характар, і асабліва яго незвычайная чуйнасць да самай малой несправядлівасці, яго схільнасць думаць, яго любоў да самога працэсу мыслення — рысы характару менавіта чалавека нашага часу.

І ўсё-такі, каб стаць прыкметным мастацкім вобразам, Казакову не хапае дзеяння, справы: ён занадта чысты, магчыма, нават занадта стэрыльны для майстра кар'ера, для чалавека, які заняты вытворчай дзейнасцю. Разважанні яго, як мы бачылі, разумныя, цікавыя і ўвогуле даволі ясна характарызуюць яго маральны воблік, але гэтага мала. Патрэбна «матэрыя» вобраза, патрэбны сітуацыі, у якіх выявіліся б нейкія новыя бакі чалавечага характару, сітуацыі, якія б выцягвалі са сферы дзейнасці Казакова. Бо, па праўдзе кажучы, на працягу ўсёй аповесці Казакоў заняты толькі тым, што думае — думае, паўтараю, хораша, тонка, а ўсё, што адбываецца на кар'еры, адбываецца, у пераважнай большасці, без яго ўдзелу. Аўтар паспадзяваўся на чысты «інтэлектуалізм» апавядання; між тым, сам выбар героя патрабаваў падзейнага сюжэта — тэма, як-ніяк, усё ж «вытворчая».

Укажам яшчэ на адзін відавочны недахоп кнігі ўвогуле: не-не ды і прамільгне ў ёй нейкая замілаванасць, нават саладжавасць. Гэтую замілаванасць у дачыненні да прыроды яшчэ можна зразумець і апраўдаць. Але калі гаворка заходзіць пра людзей, пра іх жыццё і працу, тут яна паварочваецца фальшывай ноткай не зусім поўнай праўды, ружовага аптымізму. Асабліва гэта датычыцца аповесці «Прафесары і праўдохі» — рэалістычнай па апісанні (дэталёвым, тонкім) працы, але ідылічнай па адносінах герояў аповесці да ўмоў (часта нялёгкіх), у якіх яны жывуць і працуюць.

У пісьменніка У. Кудзінава — сапраўдная руская мова і сапраўдны пісьменніцкі зрок, слых, адчуванне пахаў і колераў: сарока «крыльями и хвостом своим тормозить принялась», «клеверный дух как-то уплотнялся при быстрой езде, и чем шибче Казаков крутил педали..., тем крепче пахло ему клевером», «машина, подстать хозяину, была какой-то беспритютной и чем-то напоминала стоптанный башмак»...

Карацей, у кнізе У. Кудзінава відзён сапраўдны талент, і можна спадзявацца, што чытачы яшчэ неадночы адчуюць радасць сустрэч з яго кнігамі.

Б. КАЗАНАЎ.

Уладзімір Кудзінаў. «Падзел радасці». На рускай мове. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1968.

З ЮБІЛЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ

В. СУМАРАЎ. ЛІКБЕЗ (масла).

СЯБРЫ ДРУКАВАНАГА СЛОВА

У Віцебску адкрыўся клуб аматараў кнігі. Ен аб'ядноўвае людзей самых розных прафесій і ўзростаў, педагогаў і інжынераў, бібліятэкараў і работнікаў кнігагандлю, рабочых і служачых, пенсіянераў і юных сяброў друкаванага слова.

Пасяджэнні клуба часта праходзяць у хатніх бібліятэках аматараў. На іх мы абмяркоўваем пытанні, якія нас цікавяць. Напрыклад, «Ленін і кніга», «Мемарыяльная літаратура аб Леніне», аб прынцыпах збору асабістых бібліятэк, аб сувязях з кнігалюбамі краіны, аб розных серыях кніг, якія выпускаюцца нашымі выдавецтвамі. Часта мы абмяркоўваем і цікавыя артыкулы з часопіса «У свеце кніг». Работнікі кнігагандлю сістэматычна інфармуюць нас аб навінках, якія паступаюць у продаж.

Нядаўна адбылася сустрэча членаў клуба «Сяброў кнігі» і пакупнікоў кнігарняў з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР пісьменнікам І. Новікавым. Ен расказаў нам аб тым, як збіраўся матэрыял аб віцебскіх падпольшчыках, як пісалася кніга «Тварам да небяспекі».

Мы плануем сумесна з работнікамі бібліятэк і кнігагандлю разгарнуць шырокую прапаганду кнігі, выхоўваць новых і новых кнігалюбаў.

М. БРУКАЦ,
старшыня віцебскага «Клуба сяброў кнігі».

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За актыўны ўдзел у партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, плённую работу па ўмацаванню сувязей паміж беларускай і калмыцкай літаратурай і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння калмыцкі паэт Хонінаў Міхаіл Ванькаевіч Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

У. І. Ленін. Творы. Том 41. Выданне 4-е. 1968 г. Тыраж 1.500 экз. 590 стар. Цана 97 кап.

Сцяпан Александровіч. Гісторыя і сучаснасць. Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мастак І. Капялян. 1968 г. Тыраж 4.000 экз. 256 стар. Цана 61 кап.

Янка Брыль. Збор твораў у чатырох тамах. Том чацвёрты. Жмяня сонечных промняў. Служэнне. Свет далёкі і блізкі. Думы ў дарозе. Мастак М. Шырокаў. 1968 г. Тыраж 7.000 экз. 464 стар. Цана 1 руб.

Вакальныя ансамблі. Мастацкай самадзейнасці. 1968 г. Тыраж 5.500 экз. 32 стар. Цана 18 кап.

Максім Горкі. Казкі. Пераклад Алеся Якімовіча. Мастак Н. Паплаўская. 1968 г. Тыраж 76.000 экз. 24 стар. Цана 14 кап.

З рэпертуару Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР. Мастацкай самадзейнасці. Складальнік В. Раговіч. 1968 г. Тыраж 1.700 экз. 24 стар. Цана 17 кап.

Уладзімір Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім. Раман. Кніга другая. Сякера пры дарозе. Мастак А. Кашкурэвіч. 1968 г. Тыраж 10.000 экз. 384 стар. Цана 94 кап.

Краявіды Беларусі. Буклет. Каляровыя фатаграфіі А. і М. Ананьіных, В. Бараноўскага, М. Самахвалава. На беларускай, рускай і англійскай мовах. 1968 г. Тыраж 100.000 экз. Цана 1 руб. 6 кап.

Культура БССР. Альбом. На беларускай і рускай мовах. Аўтар тэксту Б. Стральцоў. Фатаграфіі А. Ананьінай, В. Бараноўскага, І. Змітровіча, У. Крука, У. Казлова, Ю. Іванова, Э. Трыгубовіча.

У альбоме выкарыстаны матэрыялы Беларускага тэатральнага таварыства і студыі «Беларусьфільм». Мастак Ю. Кухараў. 1968 г. Тыраж 9.800 экз. 66 стар. Цана 69 кап.

З АРХІЎНЫХ ПАЛІЦ

РУКОЮ КУПАЛЫ

Характэрны купалаўскі почырк. Даволі толькі адзін раз кінуць вокам, каб адрозніць яго ад іншых запісаў. Своеасаблівы нахіл направа; літары не вельмі прыгожыя, але досыць акуратныя і выразныя; такія характэрна купалаўскія К вялікае, а малое, з, у ...Сумніву няма: старонкі напісаны купалаўскай рукою. Іх ажно восем...

Гаворка сапраўды пойдзе пра новыя, дагэтуль невядомыя купалаўскія аўтографы. Аднак гэта радні не вершаў ці паэм, нават не лістоў ці аўтабіяграфічных матэрыялаў. Перада мною проза. Самая прыземленая проза: старонкі канторскай кнігі рэдакцыі газеты «Наша ніва», дзе ўсе запісы за чэрвень, ліпень і пачатак жніўня 1915 года вёў сам Янка Купала.

Як вядома, аўтар «Жалейкі» ў канцы 1913 года прыйшоў на працу ў рэдакцыю беларускай газеты, а ўжо 7 сакавіка 1914 года стаў падпісваць «Нашу ніву» як рэдактар (выдаўцом газеты яшчэ некаторы час лічыўся А. Уласаў). Неўзабаве, пачынаючы з № 19, які выйшаў 16 мая 1914 года, Янка Купала стаў паўнапраўным рэдактарам-выдаўцом газеты.

Клопатаў з выданнем газеты было нямала. Па-ранейшаму цэнзура не спускала вока з «Нашай нівы», не давалі спакою і чарнасоценныя газеты «Минское слово», «Виленский вестник». «Змяніўся «рэдактар-выдавец», змянілася і ідэалогія газеты», — лямантавала газета «Северо-Западная жизнь».

Нягледзячы на ўсе цэнзурныя і фінансавыя цяжкасці Я. Купала імкнецца ўзняць узровень газеты. 28 верасня 1914 года ён пісаў Б. Эпімаху-Шыпілу: «Усю душу і ўсе сілы цяпер укладваю ў «Нашу ніву», каторую стараюся паставіць па сіле магчымасці на належную вышыню. Апрача працы непамернай каля газеты, маю шмат усялякіх непрыятнасцей, звязаных і з рэдагаваннем, і з выдаваннем».

Канторская кніга газеты за 1915 год наглядна раскрывае фінансавае становішча рэдакцыі, яе жабрацкае існаванне. На 1 студзеня 1915 года на рахунку «Нашай нівы» было ўсяго-наўсяго 27 рублёў 32 капейкі, а трэба было выдаваць газету, плаціць за паперу, набор і друкаванне яе, рассылаць падпісчыкам.

Асноўныя паступленні на рахунак — падпіска. У студзені яшчэ перасылаюць грошы падпісчыкі, ёсць узносы на ўвесь год, на паўгода. 2 студзеня 1915 года прыйшло па пошце грашыма і маркамі 21 рубель 92 капейкі (прыслаў грошы на два нумары Гарадзялкоўскі, той самы памешчык з-пад Талачына, што адчыніў беларускую школу, у якой у свой час працаваў Якуб Колас). Не кожны дзень быў такі ўраджайны. Напрыклад, 5-га і 17-га студзеня прыйшло па пошце толькі па 65 капеек (падпісчыкі перасылалі грошы на газету за 3 месяцы). Як там ні было, але за студзень «наскрэблася» падпіскі больш як на 300 рублёў, каля 250 рублёў прынёс і люты, у сакавіку яшчэ 200, а там падпіска прыносіла ўсё менш і менш. Таму на ўлік бярэцца літаральна кожная капейка: маркі, прысланыя падпісчыкамі, грошы за продаж газеты і календароў агентамі і кнігарнямі, за друкаванне абвестак, ахвяраванні ад Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны, прыватных асоб.

Цяпер глянем у графу, дзе вядзецца ўлік выдаткаў.

Вось першыя студзеньскія запісы. 1 студзеня ў лік зарплаты Янка Купала атрымаў 15 рублёў, Змітрок Бядуля — 12. 3 студзеня: па 20 капеек атрымалі хлопчыкі-разносчыкі газет, 3 рублі — Я. Купала, 26 капеек пайшло на шпагат, 1 рубель атрымаў паштальён навагодняга гасцінца. З 5-га па 8-га студзеня зроблены такія выдаткі: заплочана возчыку, які прывёз календары (20 капеек), паштоўкі каштавалі 30 к., натарыусу — 75 к., дворніку — 20 капеек, насценны календар — 55 к., газа — 33 к., «Купале ў пенсію — 1 р.»... Улічваюцца ўсе дробязі: мука на клей, капіравальная папера, чырвонае чарніла, «звозчыку ў цэнзуру», воз дроў, «за 4 білеты на «Залёты» — 6 р., папраўка клямкі да дзвярэй» і г. д.

Сярод гэтых лічбаў ёсць такія, што дазваляюць удакладніць некаторыя цікавыя факты. Так, на перасылку чарговага нумара газеты падпісчыкам рэдакцыя купляла на 16 рублёў марак (на кожны нумар наклейвалася двухкапеечная марка). Значыцца, было 800 падпісчыкаў. Калі ж улічыць, што экземпляраў каля 500 забіралі кнігарні і прыватныя агенты з гарадоў і мястэчак Беларусі, каля 200 экземпляраў ішло ў продаж у Вільні, звыш 100 экземпляраў пакідалася на абмен з віленскімі, пецярбургскімі і замежнымі газетамі і часопісамі, нейкая колькасць для аўтараў і архіва, то агульны тыраж газеты складаў не менш 2000 экземпляраў. Для таго часу лічба не малая.

Запісы ў кнізе сведчаць, што газета набіралася ў друкарні У. Знамяроўскага, а друкавалася ў Марціна Кухты. За набор кожнага нумара рэдакцыя плаціла дзесяць рублёў (17 студзеня 1915 года зроблен запіс, што за набор № 1 і 2 заплочана 20 р.). Цяжэй устанавіць, колькі рэдакцыя плаціла М. Кухце за друкаванне аднаго нумара. Звычайна плаціл М. Кухце з вялікім спазненнем. 8 студзеня 1915 года было яму заплочана за друк №№ 49, 50 і 51-52 30 р. 60 к., 29 студзеня за друкаванне таксама трох нумароў (1, 2, 3), выплачана толькі 24 р. 60 к.

Запісы ў канторскай кнізе спачатку вядуцца Змітраком Бядулем (ён тады быў сакратаром рэдакцыі), а пасля Янкам Купалам. 6 чэрвеня 1915 года рэдактар-выдавец робіць уласнаручны запіс: «Астаецца з касы за Бядулем да 7 чэрвеня 3 р. 82 кап.», і ўсе рахункі далей да самага закрыцця «Нашай нівы» вядзе толькі ён сам. Праўда, запісы купалаўскай рукою трапляюцца яшчэ і раней. 9 студзеня 1915 года ён сам запісвае: «Ад п. Сайкоўскага Луцэвічу 1 р.» «Звозчык у цэнзуру — 20 к.» (20 лютага і 19 сакавіка). «Друкарні Кухты ў рахунак — 15 р.» (19 сакавіка), «Клямка і замок да вітрыны — 27 к.» (19 красавіка), «Кухце ў рахунак друкавання Н. Н. за 1915 г. — 35 р.» (20 мая) і г. д. Усе гэтыя і шматлікія іншыя запісы, зробленыя рукою Я. Купалы яшчэ да чэрвеня 1915 года, сведчаць, што рэдактар газеты займаўся разнастайнымі гаспадарчымі і фінансавымі справамі, сам абіваў парогі цэнзурнага камітэта.

З канторскай кнігі відаць не толькі, на якія сродкі існавала і як выдавалася газета, але і як жыў сам рэдактар-выдавец Янка Купала. Жылося яму не вельмі, калі прыходзілася літаральна па рублю «выбіраць» з касы рэдакцыі сваю заработную плату (ганарару, як вядома, «Наша ніва» сваім аўтарам не плаціла). Вось, напрыклад, як Я. Купала атрымліваў зарплату ў лютым 1915 года: 1 лютага 3 рублі, 2 (5 р.); 4 (1 р.); 5 (1 р.); 9 (3 р. 50 к.); 11 (5 р.); 15 (3 р.); 17 (2 р.); 18 (2 р.); 19 (1 р.); 22 (1 р.); 23 (2 р.); 24 (2 р.).

Якая была стаўка ў месяц Я. Купалы і З. Бядулі, на жаль з канторскіх выдаткаў устанавіць нельга.

У студзені 1915 года Янка Купала атрымаў 62 рублі, З. Бядуля — 42, у лютым адпаведна 31, і 30, у сакавіку — 64 і 62, у красавіку — 48 і 38, у маі — 23 і 39, у чэрвені — 33 і 39. З. Бядуля пакінуў 7 чэрвеня працу ў рэдакцыі, і Я. Купала застаўся адзін весці рэдакцыйныя справы (у ліпені ён атрымаў 40 рублёў, у жніўні — 13). Як і ў лютым, так і ва ўсе астатнія месяцы зарплату рэдактар атрымліваў у раздроб, літаральна па рублю (у касе рэдакцыі рэдка калі былі вялікія грошы). Толькі 10 сакавіка Янка Купала ў лік зарплаты атрымлівае 25 рублёў ды 6 мая спачатку 13, а потым яшчэ 10 рублёў. 8 і 28 ліпеня 1915 у кнізе купалаўскай рукою зроблены запісы: «Купала набраў дробнымі — 20 р.»

Канторская кніга заканчваецца вельмі драматычным радком: «8 жніўня. Купале на дарогу 5 р.» Справа ў тым, што 7 жніўня 1915 года выйшаў у свет апошні, 31 нумар «Нашай нівы», пасля газета спыніла сваё існаванне. Я. Купала арганізаваў рассылку газеты па пошце, а сам сабраўся ў дарогу, у Акопы, дзе жыла маці.

Запісы ў кнізе наводзяць на думку, што рэдакцыя «Нашай нівы» займалася і справамі «Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні», якое ў 1915 годзе выдала асобнай кнігай апавяданне С. Бірылы «Стражнік». Сярод іншых выдаткаў газеты за 9 красавіка 1915 г. значыцца: «За паперу на «Стражнік» — 12 р.», а 21 красавіка яшчэ адзін запіс: «Папера на акладку «Стражнік» — 5 р. 20 к.»

Кніга прыбыткаў і выдаткаў рэдакцыі газеты «Наша ніва», апошнія старонкі якой вяліся купалаўскай рукою, — цікавы матэрыял для гісторыі беларускага перыядычнага друку і летапісу жыцця Янкі Купалы. Трэба парупіцца, каб фотакопія гэтага цікавейшага дакумента трапіла ў экспазіцыю Літаратурнага музея народнага паэта (арыгінал канторскай кнігі захоўваецца ў рукапісным аддзеле Цэнтральнай бібліятэкі АН Літоўскай ССР).

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Кніжныя навінкі

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук БССР падрыхтаваў двухтомную «Гісторыю беларускай літаратурнай мовы». Пра выхад першага тома газета «Літаратура і мастацтва» паведамляла 26 снежня 1967 г. Другі том гэтай працы толькі што выйшаў у выдавецтве «Навука і тэхніка». Аўтары тома — І. Крамко, А. Юрэвіч, А. Яновіч.

Гэты том ахоплівае гісторыю беларускай літаратурнай мовы ад пачатку XIX ст. да нашых дзён.

У першым раздзеле кнігі паказваюцца тыя гістарычныя ўмовы, у якіх узнікла і пачала інтэнсіўна развівацца новая беларуская літаратурная мова. Аўтары аналізуюць моўныя асаблівасці гутарак першай паловы XIX ст., паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», а таксама малавядомых твораў — такіх, як верш «Віншаванне Савасцея», кніжка «Каротні збор навукі хрысціянскай». Даследаваны таксама асаблівасці мовы верша П. Багрыма «Заграй, заграй, хлопча малы...», твораў Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага, Я. Чачота. Асобна вызначаюцца месца і роля ў развіцці беларускай літаратурнай мовы В. Дуніна-Марцінкевіча. Далей аўтары спыняюцца на асаблівасцях публіцыстычнай мовы К. Каліноўскага, паказваюць, што новага з'явілася ў мове ананімных твораў 60-х гадоў. Прааналізавана мова твораў Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны, затым твораў А. Ельскага, М. Косіч, А. Пшчолкі, першых перакладных твораў, асабліва апавядання Ус. Гаршына «Сігнал». У заключэнне раздзела даследуюцца фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы на пачатку XX ст.

У другім раздзеле кнігі аўтары паказваюць асаблівасці развіцця беларускай літаратурнай мовы пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Тут характарызуецца першая «Беларуская граматыка» Б. Тарашкевіча, паказваецца, як распрацоўваліся пытанні правапісу і граматыкі ў 20—30-х гадах, паказваюцца шляхі выпрацоўкі лексічных норм, шляхі ўзбагачэння навуковай, тэрміналагічнай, спецыяльнай лексікі. У заключэнне даецца агульная характарыстыка беларускай літаратурнай мовы нашага часу.

Ю. ЛЯВОНЧЫК.

Рыгор Ігнаценка

Весткі з лесу

Абразкі

СНЕЖНЫЯ ВАННЫ

Сойкі асцярожныя птушкі. Але калі восенню на дубах паспеюць жалуды, яны на час забываюцца аб асцярожнасці. Цэлымі днямі птушкі навідоку ў людзей зрываюць з дрэваў спелыя жалуды і хаваюць у зацішныя месцы — зімой спатрэбяцца. Шумна бывае ў гэты час у дубняках. Толькі і чуецца ў іх гучны, прарэзлівы крык соек: «Рэ, рэ, рэ...»

Аднойчы я блукаў з ружжом па лесе. Маю ўвагу прыцягнула сойка, якая корпалася ў снезе. Я сеў на пень і стаў у бінокль сачыць за птушкай.

Зімні дзень стаяў ціхі, марозны. Кожная галінка на дрэве была ў белым шэрані, і лес быў калматы, мяккі.

На белым фоне заснежанага лесу стракатая птушка была відаць асабліва добра. Яна заўзята працавала крыламі і нагамі, усё глыбей закопваючыся ў пульхны снег. На нейкі час сойка зусім знікла з вачэй.

Але вось яна ўзляцела на куст алешніку. Крыху адпачыла і апусцілася пад маладую рабінку. Тут яна таксама стала корпацца ў снезе.

Тройчы так сойка снежныя ванны прымала. Нарэшце, змораная, уселася на рабінку і прыціхла. Пасядзела, засмучаная, нейкі час, энергічна дзюбай кіўнула, быццам плюнула ад злосці, і паляцела ў лес, мільгаючы стракатым апярэннем між белых дрэў.

Я не пайшоў туды, дзе прымала сойка снежныя ванны. Мне і так было вядома, чым там сойка займалася. Ясная справа: не асвяжалася ў дваццаціградусны мароз, а прызапашаны з восені корм шукала. Ды мышы падвялі: усе сойчыны запасы расцягнулі.

Чым яна зараз, небарака, у такую халадэчу паснедае ў лесе?..

ПАД ПОКРЫВАМ НОЧЫ

Зімовая ноч навісла над зямлёй.

Па шырокім полі поблізу лесу бяжыць лісічка. Сцелецца нізка, быццам ветрам касмыль сена па зямлі гоніць. Бяжыць лісічка па белым полі, ды час ад часу да зямлі нагінаецца. Тынецца вострай мордачкай у пульхны снег — і далей, паклоніцца — і далей.

Патануўшы на хвіліну ў сіняй нізінцы, лісічка паказалася на другі яе бок каля сцірты саломы. Тут яе нешта занепакоіла. Вось звярок прыўзняўся на заднія лапы і — скок пад сцірту. Падрыжаў дробненька пушысты хвост і супакоіўся. Абышла ліска кругом сцірту і далей патрусіла.

Праверыла чорны быльнёг на мяжы, абнюхала шматок кімсьці кінутай паперы на дарозе. Перасекшы роўным пункцірам клін азімкі, яна спусцілася да незамерзлай рачулкі і пайшла па беразе, часам спыняючыся і падоўгу ўглядаючыся ў чорную ваду.

Перайшоўшы па слізкай кладцы рачулку, лісічка апынулася каля крайніх хат у вёсцы.

Дзесьці працягла зарыпелі дзверы. Лісічка крутнулася ўправа і пайшла гародамі.

Прайшлася ля капцоў з бульбай. Нейкі час патапталася ля калгаснай канюшні, наслядзіла каля ільносушылкі. Пасядзеўшы нечага над глыбокай ямай, з якой людзі бралі гліну, яна павярнула назад — у лес. Але не адразу. Яе роўны след прайшоў яшчэ па снежным лубінавым полі і аўсянішчы. Тут рыжая кумка паласавалася палёўкамі.

Папятляўшы па маладым садзе, след пайшоў далей.

Каля невялікага пералеска на снезе віднелася з дзесятак ямак. Гэта лісічка патурбавала, шэрых курапатак, якія зарыліся нанач у мяккі снег.

Прайшоўшы кіламетры два па нізінцы, зарослай хмызняком, лісічка ўзняла ў адным месцы зайца, які, пэўна, улёгся адпачыць. Узняць яна яго ўзняла, але ўслед не пабегла. Непрыстойна куме за аблавухім гойсаць...

Дабралася ліска да цёплай нары тады, калі на ўсходзе ўжо нясмела загарэлася пунсовая палоска марознай зары. Зімняя ноч канчалася.

Рассеецца ранішні змрок, і назіральны паляўнічы прачытае па «белай кнізе» ўсе начныя прыгоды рыжай кумкі.

ГАЛІНКА АРЭШНІКУ

Зіма выдалася на дзіва злой. Бывалі, вядома, суровымі і іншыя зімы. Але варта толькі было спасці маразам альбо выглянуць нязыркаму зімняму сонцу, як тут жа ўсё ў прыродзе ажывала. Весела ў вясковым садзе пачынаў звінець срабны званочак жоўтагрудай сініцы, ажыўляліся вераб'і, засвішча на макаўцы заінелай бяроскі зелянушка, радасна забулькае белабокая сарока, прыгрэўшыся ў зацішку на сонейку.

А тут за ўсю зіму не пачуў яшчэ ніводнага птушынага голасу. Нават шэрых варон, гэтых пастаянных спадарожніц чалавечага жылля, і тых чамусьці не было відно ў вёсцы.

Пуставала і мая кармушка за вакном. Акрамя мурзатых вераб'ёў, ніхто да яе не прылятаў. Нават кавалачак сала, падвешаны на нітцы, — сінічцын ласунак, — не прывабіў птушак.

Стаў я аднаго разу на лыжы і пайшоў з дому.

Завалены снегам лес быў насуплены і маўклівы. Нішто нідзе не падавала ніводнага гуку. І толькі рэдкія сляды на снезе гаварылі аб прысутнасці тут жыцця.

Доўга паласаваў я лыжамі глыбокі снег.

Каля невялікага раўчука звярнуў увагу на высокі куст арэшніку, галінкі якога былі густа ўвешаны бурымі катышкамі. Яны былі якіясьці дробныя, сухія, здавалася, мёртвыя.

Я зрэзаў невялічкую галінку. Дома наліў у вазачку вады і апусціў у яе прынесеную галінку.

Праз тыдзень у катышках з-пад карычневага выглянула жоўтае. Было бачна, што яны прыкметна павялічыліся, сталі пульхнымі і важкімі.

Пасля на галінках лопнулі ўздутыя пупышкі і з-пад бурых лускавінак выглянулі кволыя зялёныя лісцікі. У зімнім пакоі тонка запахла вясной і лесам. І гэта першая кволая зеляніна раптам удыхнула ў мяне столькі сілы і радасці!

Госці МІНСКА

СПОВЕДЗЬ-ПЕСНЯ

Канферансье Марыян Іанкайціс глыбока ўздыхнуў. Усё! Зараз можна і адпачыць!

За кулісамі ажыўлена. Артысты віншуюць адзін аднаго з поспехам, аб нечым спрачаюцца... Толькі што закончыўся першы канцэрт новага турнэ артыстаў польскай эстрады па нашай краіне. Мінчане высока ацанілі новую праграму вядомай польскай спявачкі Рэны Рольскай, маладога спевака Барыса Стана, выкаўначае майстэрства аднаго з самых маладых у Польшчы ансамбляў—«Бізоны». І, відаць, таму так рады былі польскія артысты той буры апладысментаў, якой узнагародзілі іх слухачы. Напярэдадні — двухмесячная паездка па краіне, каля 60-ці канцэртаў. Але першыя кветкі і ўдзячныя ўсмешкі савецкіх слухачоў — дарагія ўдвая.

Так ужо атрымалася, што за апошнія паўтара месяца мінчане ўбачылі ўсю эліту польскай эстрады: самы папулярны ў Польшчы біт-ансамбль «Чырвоныя гітары», пераможцу Сопацкага фестывалю Уршулю Шчэпіньскую, польскага «Ів Мантана» — нашага старога і добрага друга Ежы Паломскага, бліскучага джазавага піяніста і акампаніятара Януша Энта, маладых спявачак Хану Канечну і Ніну Урбана...

І вось—новая сустрэча...

Над сцэнай Мінскай філармоніі—дзве літары: «Р. Р.» Гэта значыць, што тут сёння спявае Рэна Рольске —адна з самых вядомых і любімых у нашай краіне польскіх эстрадных спявачак. Да гэтых дзвюх літар я б дадаў яшчэ адну. І тады новая праграма спявачкі называлася б «Р. Р. Р.» — «Рамантыка Рэны Рольскай». Рольска вельмі рамантычная. Яе песні ў нечым блізкія да песень вялікай Эдзіт Піяф. Вельмі ўмоўна іх можна назваць песнямі-марамі — аб будучым, чалавечых надзеях, аб каханні... І мары гэтыя не проста «вісяць у паветрыі»—гераіня гэтых песень хоча, каб надзеі збыліся, і прымушае нас верыць у тое, што яны збудуцца. І мы, слухачы, верым—таму, што актрыса робіць іх і нашымі марамі.

Я запытаўся ў Рэны Рольскай, што б яна выканала, калі б сёння ў яе з'явілася магчымасць спець толькі адну песню адразу для ўсяго чалавецтва? Яна задумалася, а потым упэўнена сказала:

— Песню Піетшака «Не забывайце аб садах»!

Гэта песня займае своеасаблівае месца ў сённяшнім рэпертуары-споведзі спявачкі... «Не забывайце аб садах—гэта ж сімвал жыцця. Няхай зямлю пакрываюць не бліндажы, а квітнеючыя сады, і няхай сімвалам нашага стагоддзя будуць паэты»,—вось што, прыблізна, спявае Рэна Рольска. Спявачка выказвае запаветную мару аб міры і робіць гэта надзвычай шчыра, у трапяткой па пачуццях рамантычнай песні. Яна і вядзе споведзь ад сэрца і стварае прывабны характар гераіні песні.

А вось Рольска ў песні «Заўтра Варшава» кампазітара Пенткоўскага. Песня гордая і ўзнёслая, і яе ўспрымаеш як гімн Рэны Рольскай у гонар сталіцы—старажытнай і заўсёды юнай, багатай на незвычайную біяграфію. І неяк натуральна зноў гаворыць пра рамантыкоў, якія ўзнялі Варшаву, горад над Віслай, дзе ніколі, здаецца, не гасне сонца чалавечага хараства.

Песню слухачы прынялі авацыяй. Гэта былі авацыі не толькі ў адрас выканаўцы, гэта былі і апладысменты тым, хто роўна 24 гады назад вызваліў польскую сталіцу ад фашысцкай няволі.

Так — ад рамантычнай, трохі нават сентыментальнай, афарбоўкі і да такіх вось жыццёва ўсім нам знаёмых і зразумелых матываў—спявае Рэна Рольска. Яе вабіць, я сказаў бы, не столькі магчымасць праспяваць добрую песню, колькі з дапамогай музыкі сказаць сваё слова пра перажытае ёю, пра тое, аб чым нельга не спяваць.

Вось Рольска спявае аб простым чалавечым шчасці — шчасці любіць. Гераіня песні марыць аб першым каханні, як марыць аб ім семнаццацігадовая дзяўчынка («Цыганка» Б. Клімчука) і сумуе аб страчаным шчасці, як трыццацігадовы чалавек, які ведае жыццё («Калі гараць ружы» Е. Палаша). Спявачка ўмее пераўвасобіцца, быць то сумнай, то адчайна гарэзлівай, бо не толькі спявае, але і іграе песню як таленавітая актрыса. І гэтае ўменне дапамагае ёй нават згладжваць іншы раз недахопы самой песні, пагрэшнасці перакладу (Рольска спявае большасць песень на рускай мове). Так у яе выкананні трохі пашлаваты тэкст песенькі «Госць з таго свету» гучыць як забаўны жарт, не больш.

Рэну Рольску наўрад ці трэба прадстаўляць чытачам—гэта ж яе дзевяты прыезд у нашу краіну. Дарэчы, першыя яе замежныя гастролі адбыліся ў нашай краіне роўна дзесяць гадоў назад.

А вось Барыс Стан—упершыню ў нашай краіне. Больш дакладна—упершыню як спявак. Два гады назад ён разам з Ольштынскім драматычным тэатрам, дзе быў акцёрам, гастраліраваў у Львове. У сябе на радзіме гэты малады спявак ужо даволі папулярны, ён заваяваў першы прыз на фестывалі польскай песні ў Аполе, з поспехам выступаў у ГДР, Францыі і Аўстрыі. Яго «спецыяльнасць»—песні, папулярныя сёння сярод моладзі планеты — песні пратэсту супраць вайны, супраць расізму... Прычым, тэксты новых песень Барыс піша сам; іх арыгінальнасць у тым, што яны заснаваны на народных матывах карпацкіх горцаў. Дарэчы, на Сопацкім фестывалі Віктар Вуячыч выконваў песню з рэпертуару Барыса Стана «Бомбы падаюць сёння». Вядома, спявае Стан і іншыя песні. Лепш за ўсё ўдаюцца яму сумныя, рамантычныя (бачыце, і тут рамантыка!) балады аб каханні. І вельмі прыемна, што ён як аўтар і выканаўца, не ідзе па пратаптанай сцежцы, а шукае сваіх, новых дарог у маладзёжнай песні.

Суправаджае выступленне салістаў інструментальны ансамбль «Бізоны» пад кіраўніцтвам Збігнева Бізаня. Ансамбль, які таксама з'яўляецца шукальнікам у эстрадным мастацтве. А асноўная яго заслуга, на нашу думку, у тым, што яму ўдалося спалучыць сучасны рытм біг-біта і выразныя сродкі традыцыйнага джаза з некаторымі традыцыямі народнай польскай музыкі. Гэта асабліва ярка праявілася ў акампанеменце песням Барыса Стана. Хацелася б толькі зрабіць польскім музыкантам адну заўвагу — нам здалося, што на сцэне яны выглядаюць празмерна экзатычна. Тым больш, што аркестр у асноўным толькі акампаніруе.

Такім чынам, першы канцэрт праграмы «Спявае Рэна Рольска» на савецкай зямлі прайшоў на выдатна! Пажадаем польскім артыстам, каб наступныя шэсцьдзесят выступленняў у нашай краіне былі такія ж паспяховыя.

Б. ГЕРСТАН.

Куток калекцыянера

СКАРБЫ РУСКАГА МУЗЕЯ

Усе большай папулярнасцю ў філатэлістаў розных краін карыстаюцца паштовыя маркі, на якіх узноўлены лепшыя творы сусветнага жывапісу, скульптуры.

За апошнія гады Міністэрства сувязі СССР выпусціла дзве вялікія серыі такіх марак—«Дзяржаўны Эрмітаж» і «Траццякоўская галерэя».

Напярэдадні новага года ў паштовы абыход паступіла серыя з дзесяці марак. На іх—фотарэпрадукцыі з карцін рускіх і савецкіх мастакоў, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным рускім музеі ў Ленінградзе.

На марцы наміналам у адну капейку ўзноўлена карціна «Жняцы» Аляксея Венецыянава, выдатнага мастака, аднаго з заснавальнікаў бытавога жанру ў рускім жывапісе. Яна напісана ў дваццатых гадах мінулага стагоддзя.

Рэпрадукцыя карціны выдатнага рускага мастака Карла Брулова «Апошні дзень Пампеі», над якой ён працаваў з 1830 па 1833 год, узноўлена на марцы дзвюхкапеечнай вартасці.

Паштовая мініяцюра вартасцю ў тры капейкі выйшла з рэпрадукцыяй карціны «Віцязь на раздарожжы», выдатнага рускага жывапісца-перасдвіжніка Віктара Васняцова, які неаднаразова звяртаўся ў сваёй творчасці да вобразаў нацыянальнай гісторыі, рускіх былін і народных казак. Карціна напісана ў 1882 годзе.

Рэпрадукцыя з карціны выдатнага рускага мастака Васілія Сурыкава «Узяцце снежнага гарадка» (1891 г.) з'яўляецца сюжэтам маркі наміналам у 4 капейкі.

На шасцікапеечнай марцы—рэпрадукцыя з карціны выдатнага рускага жывапісца Ісаака Левітана «Возера» (1899—1900 гг.), у якой ён стварыў цудоўны па сваёй абагульняючай сіле вобраз рускай прыроды.

Карціна К. С. Пятрова-Водкіна «1919 год. Трывога», напісаная ў 1934 годзе, адлюстравана на паштовай мініяцюры коштам у 10 капеек. Малюнак 16-капеечнай маркі рэпрадукцыруе карціну вядомага савецкага мастака Аляксандра Даінекі «Абарона Севастопаля». Яна прысвечана бессмяротным подзвігам маракоў-абаронцаў горада-героя ў 1941—1942 гадах.

Фрагмент карціны савецкага мастака Г. М. Коржава «Гамер» (рабочая студыя) паслужыў сюжэтам для 20-капеечнай маркі.

На мініяцюры наміналам у 30 капеек рэпрадукцыя карціны «Свята на плошчы Урыцкага ў гонар адкрыцця II кангрэсу Камінтэрна» Барыса Кустадзіева, віднага рускага савецкага жывапісца, тэатральнага мастака-дэкаратара, графіка і скульптара.

На малюнку пяцідзесяцікапеечнай маркі-рэпрадукцыі шырока вядомай карціны савецкага жывапісца М. І. Авілава «Пядзянак Перасвету з Чалубеем». Гэты пядзянак папярэднічаў славутай Кулікоўскай бітве, якая паклала пачатак вызваленню рускіх земляў ад прыгнёту Залатой Арды.

Арыгіналы ўсіх дзесяці марак падрыхтаваны мастакамі Германам Камлёвым і Аляксандрам Разанцавым.

Друкаванне афсетнае. Зубцоўка грабеньчатая. Папера мелаваная. Памер па перфарацыі марак коштам 1, 10 і 20 капеек—37 на 52 міліметры, астатніх марак—32,5 на 65 міліметраў. Маркі шматкаляровыя. Нумары па каталогу з 3744 па 3753 уключна.

А. МАРКУС. (АДН).



З ДАЛЁКІХ ПАДАРОЖЖАЎ

Алесь Савіцкі
Віталій Смірноў

На аўстрыйскай зямлі

НА БЕРАЗЕ Дуная, на стапелях суднаверфі, зараз відаць абрысы двух вялізных пасажырскіх цеплаходаў, што ў хуткім часе будуць здадзены заказчыку. А заказчык — наша краіна.

Дырэктар суднаверфі пан Шварц паведаміў нам, з гонарам пазіраючы на абрысы гэтых суднаў:

— Найноўшыя караблі. Плаваць на іх людзі будуць з камфортам. Кожная каюта — нібы выдатны нумар гасцініцы...

Мы бачылі адну з такіх кают. У натуральную велічыню яна выстаўлена ў кутку рабочага клуба: кожны можа зайсці і пацікавіцца. А гасцям яе паказваюць абавязкова. І трэба прызнацца, што нездарма паказваюць, бо паглядзець ёсць на што. Зручны столік ля ілюмінатара. Мяккія ложкі, якія на дзень убіраюцца і вызваляюць шмат месца ў каюце, робяць яе сапраўды падобнай на пакой. Прыгожыя і зручныя для сядзення крэслы. Кампактныя душавы і туалетны блокі, дзе толькі нержавейка і каляровы пластык.

Ля ўваходу ў каюту, на сценцы пад шклом, вісіць звычайны малаток на драўлянай ручцы. Рэліквія... Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. В. Падгорны папрацаваў ім, калі на суднаверфі пачыналі выконваць вялікі савецкі заказ. Многія судны з таго заказу ўжо даўно працуюць. Усе яны прыняты прыдзірлівымі камісіямі з высокай адзнакаю.

На суднаверфі створана і актыўна працуе аддзяленне Аўстра-савецкага таварыства. Яго работа вялікая і карысная—гутаркі, даклады, сустрэчы, дэманстрацыя савецкіх кінафільмаў.

Старшыня аддзялення пан Расетка паведаміў нам:

— Многія суднабудаўнікі нашай верфі былі ў Савецкім Саюзе. Цікавасць рабочых да Савецкага Саюза — незвычайная. Часам бывае: лектар перабліытае, не тую лічбу скажа. Яго тут жа, з залы, папраўляюць. На маю думку, гэта паказальна.

І кіраўніцтва суднаверфі, і рабочыя высока ацэньваюць савецкае абсталяванне, якое працуе на прадпрыемстве.

— Вашы станкі пры аднолькавых паказчыках працуюць лепей, чым станкі праслаўленых фірмаў іншых краін.

Бургамістр Карнойбурга Кукенбергер з добрай мерай сяброўскага гумару сказаў нам, што яго, маўляў, меней усяго цікавяць тэхнічныя і палітычныя моманты ў жыцці суднаверфі: ён ацэньвае яе дзейнасць зусім па іншых паказчыках — па колькасці падаткаў, якія дае прадпрыемства ў казну магістрата. Жартуючы, але з адценнем сур'ёзнасці, ён дадаў:

— Я самы шчаслівы з бургамістраў, бо ў нашай акрузе ёсць суднаверф — самы буйны і самы надзейны падаткаплацельшчык. Самая хранічная «хвароба» ўсіх бургамістраў — мала часу і мала грошай у казне. А выдаткі вялікія: дарогі, школы...

КРЫХУ ПАЗНЕЙ мы аглядалі старадаўні замак, які мае велізарную калекцыю рыцарскай зброі ўсіх часоў і ўнікальную калекцыю рэчаў народнага побыту мінулых стагоддзяў. Замак стаіць на гары, пабудаваны з шызага каменю, крыху падобны на славуты Варанцоўскі палац у Крыму. З гары відзён бераг Дуная і другі замак на супрацьлеглым беразе. Гледзячы на той замак, бургамістр зазначыў, што час усё змяняе: некалі гэтыя два замкі былі варотамі да Вены. А цяпер вароты да кожнага горада і краіны—людскія сэрцы.

Добрае прызнанне. Сапраўды, цяпло людскіх сэрцаў — гэта тыя вароты, праз якія можна прыйсці ў любую краіну, у любы горад.

Мы чулі аналагічнае прызнанне і на афіцыйным прыёме ў магістраце Мёдлінга, невялічкага гарадка, што непадалёк ад Вены. Гарадок вузкай паласою цягнецца паміж горных схілаў, заснежаных уверсе і зялёных унізе.

— Гэта добра, што вы расказваеце нам пра сваё пяцідзесяцігоддзе, — сказаў гарадскі саветнік пан Гаснер. — У нас таксама невялічкі юбілей: адной са школ нашага горада спаўняецца паўстагоддзя.

Мы былі ў гэтай школе — Томас-шуле. Праўда, папярэдне, па дарозе да яе нам паказалі жаночую школу. У Мёдлінгу ёсць школы з сумесным навучаннем, але нам паказалі гэтыя — жаночую і мужчынскую.

Жаночая школа размешчана ў новым будынку. Абсалютна сучасным, пабудаваным зусім нядаўна ў простым, рацыянальным стылі, з прымяненнем сучасных будаўнічых матэрыялаў. Калі ўвойдзеш у школу, дык робіцца зразумелым, чаму гаспадары горада спачатку паказваюць менавіта яе: гэткай школай можа ганарыцца любы сучасны горад. У школе, разлічанай на навучанне з выкарыстаннем найноўшых дасягненняў педагагічнай навукі, ёсць літаральна ўсё для разумнай, паспяховай вучобы: выдатныя класы, дзе шмат кветак і прадуледжана ўсё да дробязяў, цудоўная спартыўная зала, дзе паветра чыстае, як у полі, зручныя прылады для заняткаў амаль ўсімі відамі спорту.

Томас-шуле, якой спаўняецца пяцьдзесят год, размешчана ў старым будынку. Але тут, у гэтым старым будынку, з тоўстымі, казарменнага тыпу сценамі і цяжкімі лесвіцамі, у будынку, дзе некалі асноўнай навукай лічыўся нацызм, зараз уладарна гаспадараць новыя ветры.

У школе вучацца толькі хлопчыкі. Яны і выкладчыкі сустрэлі нас у вестыбюлі, сустрэлі кветкамі і цёплымі словамі прывітання. Хор хлопчыкаў малодшых класаў выканаў песні савецкіх кампазітараў. Песні спяваліся на нямецкай мове. Але — рускія песні, і ў вачах хлопчыкаў былі захапленне і гонар.

Рызыкоўна, вядома, сказаць нешта пэўнае — ухваляць ці ганіць — сістэму навучання ў Томас-шуле. Але тое, што мы бачылі ў вестыбюлі школы, у часе сустрэчы з вучнямі і настаўнікамі, што бачылі потым на ўроку малявання, што бачылі ў школьных майстэрнях — даволі пераканаўчы доказ, што тут сур'ёзна дбаюць аб выхаванні сапраўдных грамадзян свае краіны, аб выхаванні найгалоўнейшай якасці ў чалавеку—чалавечнасці.

Урок малявання, які нам давялося пабачыць, вяла маладая настаўніца. Яна крыху бянтэжылася, хвалявалася, хадзіла ля парт і клапатліва назірала за працаю сваіх выхаванцаў. Час ад часу настаўніца прыпынялася каля аднаго ці другога, брала ў рукі аловак, нешта паказвала, нешта раіла. Вучні слухалі яе і маляваді з ахвотаю. Што? Тое, аб чым думалася ім, што было на душы, у сэрцы. Адзін маляваў зімовы лес. Другі — парк. Трэці — птушак, што ляцяць у высокім блакіце неба.

А на сценах класа былі размешчаны малюнкі мінскіх школьнікаў, атрыманых праз аддзяленне Аўстра-савецкага таварыства. На іх таксама былі намаляваны і дарога ў зімовы лес, і шырокая алея восеньскага парку, і птушкі. Адны малюнкі былі зроблены фарбаю, другія — каляровымі алоўкамі. І гэтак жа маляваді ў класе — фарбамі і алоўкамі. Але і тыя малюнкі, што былі на сценах класа, і незавершаныя яшчэ, што ляжалі на партах аўстрыйскіх школьнікаў, былі аднолькава непасрэдныя, у кожным было сваё, няхай сабе крыху наіўнае, бачанне свету, была тая дзівосная дзіцячая цеплыня, што аднолькава хвалюе і нас, дарослых.

І такая ж цеплыня была ў дзіцячых вачах, калі дзеці аддавалі нам пісьмо мінскім школьнікам. Маленькае пісьмо з вялікім і знамянальным зместам — вучні Томас-шуле жадаюць сябраваць з мінскімі школьнікамі.

І такая ж цеплыня — шчырая і непадробленая — была на твары Энрыка Отчыца, рухавага, маленькага хлопчыка, які ўручаў нам свой просты падарунак — белы металёвы сцяжок, на якім пункцірам была прастукана пяцікутная зорка. За час, пакуль мы аглядалі майстэрні — вельмі добрыя, разумна спланаваныя і добра абсталяваныя памяшканні, дзе вучні прывучаюцца да працы з дрэвам, металам, пластыкам — Энрык паспеў зрабіць гэты маленькі сувенір.

І такая ж цеплыня была ў позірку дырэктара Томас-шуле Фрыдрыха Мілера, жвавага, энергічнага мужчыны, з хуткімі, смелымі вачыма, калі ён гаварыў пры развітанні:

— Мы будзем чакаць пісьмаў ад мінскіх школьнікаў. Сяброўства з імі вельмі важна не толькі для нашай школы. Важна для ўсіх іншых школ. Важна наогул для выхаваўчай работы.

У ЗАЛЬЦБУРГУ мы аглядалі помнікі старажытнасці, пабывалі ў доме-музеі Моцарта, у вялікай і малой канцэртных залах, дзе праводзяцца традыцыйныя музычныя фестывалі. У Крэмсе аглядалі новы будынак педагагічнай акадэміі. Зразумела, нам паказвалі лепшае, тое, чым можна ганарыцца: благое само трапляе на вока.

У пакоі на другім паверсе педагагічнай акадэміі ў Крэмсе мы ўбачылі намаляванае прыгожай вяззю мудрае лацінскае выслоўе: гасподзь дае нам арэхі, але ён не расколвае іх. Ёсць у гэтым выслоўі і вялікая жыццёвая мудрасць: калі хочаш ведаць, што там, у арэшку, трэба папрацаваць. Без працы табе, чалавеча, нічога не адкрыецца, нічога не дасца на зямлі.

Думаецца, што гэтай мудрасцю кіраваўся і рэктарат інстытута славістыкі Венскага універсітэта, калі планаваў для студэнтаў-славістаў даклад аб беларускай літаратуры на беларускай мове. На мове, якою некалі так грэбавалі царскія служкі і нашы дамаслые шляхцюкі.

Мы прыйшлі ва універсітэт раней вызначанага тэрміну — хацелася што-кольвек паглядзець, паназіраць. Ля ўваходу — рэкламныя шчыты, розныя аб'явы. У дзвярах— некалькі студэнтаў, і іх не абмінеш: яны ўручаюць кожнаму белыя і ружаватыя лісткі з праграмаю студэнцкіх дыспутаў. Дыспуты праводзяцца на самыя розныя тэмы, пачынаючы ад сучасных палітычных праблем да праблем сексуальнага жыцця.

Са студэнтамі інстытута славістыкі мы размаўлялі ў невялічкай па памерах, але даволі светлай аўдыторыі. Яны стрэлі нас частым і гучным пастукваннем па сталах — знак павагі і прывітання. На доўгіх сталах была разгорнута выстаўка беларускіх кніг. Былі тут і два тамы «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры», двухтомная «Анталогія беларускага апавядання», літаратуразнаўчыя працы, старыя выданні. Слухалі нас з увагаю. Слухалі, каб зразумець, слухалі, аддаючы даніну павагі народу, які мае чым ганарыцца. Слухалі, каб пачуць гучанне беларускага слова, зразумець яго сэнс. Слухалі, захапляючыся сённяшняй светлай явай раней прыгнечанага народа.

Беларускае слова, беларуская кніга ў Венскім універсітэце...

Над гэтымі фактамі варта паразважаць. Іх не пашкодзіла б ведаць тым нашым «дабразычліўцам», якія туляцца зараз за мяжою і гарляць аб нейкім нібыта «заняпадзе» беларускага слова, аб нейкай нібыта «інфляцыі» беларускай культуры. Няхай гарляць. Мы з усмешкаю пазіраем на гэта, бо бачым, як працоўныя людзі шмат якіх краін, маладыя хлопцы і дзяўчаты не толькі Венскага універсітэта прагна цягнуцца да нашай культуры, жадаюць ведаць яе, жадаюць разумець і вывучаць тое вялікае мастацтва, што ствараў і стварае народ беларускай зямлі.

ВЕНА — горад прыгожы, горад з вялікімі традыцыямі, горад, дзе старажытнасць разумна суседзіцца з самымі найноўшымі дасягненнямі будаўнічай тэхнікі, горад бліскучай музычнасці, незвычайнай ветлівасці.

І горад кантрастаў.

Вельмі звычайная з'ява для Вены — дарагоўля. Добры білет у оперу каштуе столькі ж, колькі найлепшая нейлонавая кашуля. Крыху меней — добры білет у аперэту. Венцу з сярэднім заработкам не лёгка захапляцца музычным мастацтвам і наведваць з сям'ёй оперу. Ды і ў кіно не вельмі разгонішся — білеты таксама параўнаўча дарагія. Мы былі ў некаторых кінатэатрах—фільмы дэманструюцца пры вельмі малой колькасці гледачоў.

Мы бачылі Вену ўдзень. Бачылі Вену на світанні. Бачылі Вену ноччу. Ноччу, бадай, яна найбольш прыгожая.

У ззянні рэкламных агнёў, у бляску ярка асветленых вітрын шматлікіх магазінаў не так прыкметна ўсё тое, што вельмі кідаецца ў вочы ўдзень — цесната вуліц, скошаныя рамы старых будынкаў, пустыя, без пакупнікоў магазіны, ярлыкі цэн...

Начная Вена жыве па сваіх законах — жорсткіх і бязлітасных. У восем гадзін усе магазіны зачынены. Але вы і дзесяці крокаў не пройдзеце, каб вам не ўручылі бясплатную рэкламку—запрашэнне на стрыптыз. Рэкламкі розныя па колеру — жоўтыя, ружовыя. І плата — за ўваход толькі! — таксама розная: шэсцьдзесят, трыццаць шылінгаў...

Мы бачылі ў Вене і звычайную жабрацкую руку, працягнутую завучана і без сораму. Жабрак ля бліскучых вітрын бліскучых магазінаў, дзе ёсць літаральна ўсё, што ты захочаш купіць! Мы прыгледзеліся да аднаго жабрака, які сядзеў на Кертнерштрасе — адной з раскошных вуліц Вены — непадалёк ад уваходу ў вялікі фірменны магазін. Ён сядзеў на кукішках, у карычневым, даволі паношаным паліто, няголены, і, прыжмурыўшы вочы, глядзеў на бліскучыя машыны, што праляталі на вялікай хуткасці па вуліцы, глядзеў, скрыжаваўшы рукі на грудзях. У вітрынах яшчэ не пагасла электрычнае святло, і здавалася, што сівыя валасы жабрака пасыпаны попелам. У капелюшы жаўцела нейкая драбяза. Венцы паспешліва прабягалі ля працягнутай рукі, нібыта не заўважалі яе, нават не глядзелі ў той бок. На жабрака, маўляў, глядзець няма чаго. Жабрак — гэта той, хто не выстаяў у змаганні з канкурэнтамі.

Але затое, калі яны ёсць у вашай кішэні — шылінгі, долары, маркі, — калі ёсць нейкія каштоўнасці, якія можна ператварыць у шылінгі, вы — гаспадар. Тады вам — ветлівая ўсмешка і пачціва пададзенае паліто ў рэстаране. Тады вам адкрыюцца любыя дзверы, вы купіце тое, што захочаце, пачынаючы ад жавальнай гумкі за тры шылінгі да самай прыгожай жанчыны за... Тут таксама ўсё залежыць ад тых жа шылінгаў. На Марыя-хільтэрштрасе вы можаце купіць жанчыну з самым раскошным аўтамабілем. Можаце купіць без аўтамабіля. Калі вам не па густу асветленая безліччу рэкламных агнёў вуліца, вы можаце пайсці на алеі Пратара—вялізнага і прыгожага парку на беразе Дуная — і купіць там тое ж, толькі значна дзешавейшае. І можаце непадалёк купіць месца ў начным гатэлі — на паўгадзіны, на гадзіну, дзве... На месяц! У вас нічога не папытаюць — толькі шылінгі...

Можна купіць усё... Гандлёвая Вена не толькі сцвярджае гэта, — але і прапаноўвае ўсё на любы густ. Нават старыя ўзнагароды і рэгаліі гітлераўскай арміі, пачынаючы ад жалезнага рыцарскага крыжа і генеральскага мундзіра да патрапанай салдацкай пілоткі. Гэты «тавар» таксама вы можаце ўбачыць на вітрыне маленькай крамы ў цэнтрыі завулку.

Можна купіць усё.

І, кіруючыся гэтым законам, некаторыя дзялкі пачынаюць спачатку ўпотай, а потым і з пэўнай рэкламай, гандляваць, тым, за што было заплочана крызёю ў нядаўняй вайне. У адпаведнасці з Дагаворам аб нейтралітэце Аўстрыя ўзяла на сябе пэўныя абавязкі, як нейтральная краіна. Прычым, у адным з пунктаў гэтага дагавору запісана даволі ясна і зразумела аб неабходнасці выкаранення з палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця Аўстрыі ўсіх слядоў царызму. Чорным па белым, як кажуць. Але насуперак гэтаму патрабаванню на паліцах некаторых венскіх кнігарняў з'яўляюцца так званыя «працы», у якіх так званыя «гісторыкі» пад рознымі падлівамі спрабуюць апраўдаць злачынствы нацыстаў у другой сусветнай вайне, не толькі бессаромна скажаюць мэты руху Супраціўлення фашызму, але і паклёпнічаюць на ўдзельнікаў гэтага руху. Адзін спрытны выдавец нават пачаў выдаваць васьмітомнік пад назваю: «Гісторыя таго, як Германія была аб'яўлена па-за законам».

Гэтыя факты наводзяць на сур'ёзны роздум.

Так, можна купіць усё, як абвяшчае гандлёвая Вена. Але працоўныя Аўстрыі зусім недвухсэнсоўна сцвярджаюць, што, на шчасце, не ўсё прадаецца.

Шчыры сяброўскі позірк — не прадаецца.

Цёплы поціск сяброўскай рукі — не прадаецца.

Прыветная шчырасць сяброўскіх сэрцаў — не прадаецца.

Не прадаецца памяць аб тых салдатах, што ляжаць пад цяжкімі плітамі помніка на адной з цэнтральных плошчаў аўстрыйскай сталіцы.

Вось чаму будучыня Аўстрыі належыць не тым дзялкам, якія спрабуюць гандляваць крывёю і гісторыяй народа. Яна, гэтая будучыня, належыць тым рабочым, што ставяць на стапелях верфі ў Карнойбургу добрыя сучасныя караблі, тым, хто будуе выдатныя дарогі, хто стаіць ля станкоў, хто сваёю працай стварае нацыянальныя багацці краіны, належыць тым хлопцам і дзяўчатам, што зараз сядзяць за школьнымі партамі, у студэнцкіх аўдыторыях і вучаць гісторыю свайго народа і гісторыю іншых народаў, вучаць, каб не паўтараць ніколі памылак, вучацца, каб больш і глыбей разумець іншыя народы і жыць з імі ў сяброўстве, міру, згодзе.

ДАМОЎ мы ад'язджалі з Вены позна ўвечары.

Замглёнае неба нізка вісела над горадам. Фрыц Трэнклер упэўнена вёў свой «форд» па вузкаму калідору рознакаляровых машын, што спыніліся на ноч усцяж тратуараў абапал вуліцы — цесна, адна да адной. Водсвет рэкламных агнёў дрогка трымцеў на чырвоным капоце машыны, на чорных скураных сядзеннях, і твар Трэнклера ад гэтых сполахаў каляровага агню быў крыху суровы і замкнёны. Усе гэтыя дні Трэнклер быў разам з намі ў паездках, сустрэчах, і мы ўжо даволі добра ведалі яго біяграфію, складаную, поўную вялікіх нечаканасцей і трывог. Рабочыя стачкі. Інтэрнацыянальная брыгада ў Іспаніі. Эміграцыя. Партызанскі атрад. Актыўная праца ў аддзяленні Таварыства. Так, пра такіх людзей пішуць кнігі. Мы сказалі, што кніга ўспрымаў такога чалавека была б карысная для моладзі. Ён з усмешкаю паківаў галавой у адказ на нашы словы:

— А час? Дзе яго ўзяць? Няма ў мяне на тое пісанне часу...

Да вакзала даехалі хутка, адправілі ў вагон рэчы. Вячэралі ў кафетэрыі на другім паверсе. Заказалі венскае піва. Яго прынеслі ў высокіх вузкіх куфлях. Піва было смачнае, але нам здалося што была ў ім горыч расстання.

Крыху прыпазніўшыся, прыбегла развітацца Барбара Шубік, высокая, чарнавокая студэнтка, якая дапамагала нам у перакладчыцкай справе. Барбара вучыцца і вядзе курсы рускай мовы. Яна прынесла нам у падарунак пласцінку з вальсамі Штрауса.

— Няхай яны нагадваюць вам аб нашай Вене,—сказала яна.

Цягнік адыходзіў блізка ля поўначы. На пероне пад нізкім дахам было ветрана і холадна. Але развітальны поціск рук быў моцны і цёплы.

Поціск сяброўскіх рук.

Заканчэнне. Пачатак у № 5 (2274)

ЧЫТАЧЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

□ Старшы інжынер дыстанцыі сігналізацыі і сувязі станцыі Орша А. Шапчыц даўно пасябраваў з кінакамерай. Ён зняў некалькі дакументальных стужак пра сваіх зямляноў і родны горад. Цяпер ён працуе над новым фільмам, у якім расказка, як працоўныя Оршы рыхтуюцца да 100-годдзя з дня нараджэння вялікага правадыра працоўных У. І. Леніна.

Л. ШЫДЛОЎСКІ.

□ Першую гастрольную паездку за межы вобласці ў новым годзе Віцебскі танцавальны ансамбль «Маладосць» зрабіў на Смаленшчыну. У Смаленску канцэрт ансамбля прайшоў пры перапоўненай зале.

На зваротным шляху танцавальны калектыў выступаў перад сельскімі гледачамі.

Цікавыя гастрольныя маршруты ансамбля намечаны таксама па братніх прыбалтыйскіх рэспубліках.

А. АРЦЕМАЎ.

□ Прэм'ера па п'есе Г. Мамлі-на «Абеліск» адбылася ў самадзейным тэатры юнага гледача Віцебскага педагагічнага інстытута (рэжысёр Серафіма Розенберг). У спектаклі, які цёпла прынялі гледачы, удзельнічаюць студэнты Р. Данілаў, Л. Зезіна, В. Іваноў, Л. Пішчыкава, вучань другой сярэдняй школы А. Кудрашоў і іншыя.

А. ПАДЛІПС П.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Паважаны таварыш рэдактар!

Дазвольце праз вашу газету выказаць сардэчную ўдзячнасць сябрам, таварышам, установам і арганізацыям, якія павіншавалі мяне ў сувязі з прысуджэннем Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы.

Аляксей ПЫСІН.

г. Магілёў.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

21 студзеня

Першая праграма 9-10 — тэлебачанне — школе. Фізіка. 10-ы клас. «Ультрагук і яго прымяненне». 9-40 — для школьнікаў. «Алька і стары капітан». Тэлевізійны фільм. 17-00 — «Навіны». 17-10 — праграма перадач. 17-15 — літаратурны тэатр. Паэма У. Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін» (М). 18-00 — для школьнікаў. «Дзіцячы дом у Горках». 18-30 — ленінскі універсітэт мільёнаў. Палітэканомія сацыялізма. У. І. Ленін. «Пра значэнне золата цяпер і пасля поўнай перамогі сацыялізма» (М). 19-00 — Л. Ляонаў. «Барсукі». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Частка 1-я (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — «Першы кур'ер». Мастацкі фільм. 22-45 — «Балвы рэзерв армії». 22-55 — «Навіны». «Каментарыі». Праграма перадач. 23-10 — для студэнтаў вну. «Тэхналогія металаў».

Другая праграма 18-00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Музычны перамок». Перадача з Пярмі. 18-30 — «Іграе Д. Ойстрах». Фільм-канцэрт. 20-00 — рэклама, аб'явы. 20-15 — экран — завочнікам. Палітэканомія. «Асаблівасці ўзнаўлення капіталу ў сучасных умовах». Лекцыя кандыдата эканамічных навук Я. А. Язвінскай. 20-45 — экран — заочнікам. Гісторыя КПСС. «Партыя бальшавікоў напярэдадні і ў гады першай рэвалюцыі ў Расіі (1904—1907 гг.)». Лекцыя кандыдата гістарычных навук В. А. Баркана. 21-15 — «У дні Кастрычніка». Мастацкі фільм (М).

22 студзеня

Першая праграма 9-10 — тэлебачанне — школе. Біялогія. 10-ы клас. «Нуклеінавыя кіслоты». 9-40 — «Мы ішлі з Цыпочкам». Кінанарыс. 10-00 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя» (М). 10-45 Л. Ляонаў. «Барсукі». Тэлевізійны спектакль. Частка першая (М). 12-15 — «Табе, юнацтва!» «Таварыш падлетак». Перадача з Кішынёва. 16-15 — «Навіны». 16-25 — праграма перадач. 16-30 — школьная фільматэка. «Чапаеў». Мастацкі фільм. 18-10 — «Навіны». 18-30 — «Твая ленінская бібліятэка». «Тры крыніцы і тры састаўныя часткі марксізма» (М) 19-00 — Л. Ляонаў. «Барсукі». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Частка 2-я (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — насустрач выбарам у мясцовыя Саветы БССР. «Тэлевізійны